# ПРЭЗІДЭНТ ЗНАХОДЗІЦЦА З ВІЗІТАМ У КІТАІ

**У КНР Аляксандр ЛУКАШЭНКА прыбыў учора позна ўвечары па мясцовым часе.**



(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЧЭРВЕНЯ АЎТОРАК № 105 (30493)




# КАБ БЫЛО ЎРАДЖАЙНАЕ ПОЛЕ

**Як прамысловы гігант з Гродна працуе на паляпшэнне якасці прадукцыі — фактычна на харчовую бяспеку краіны**

Прадукцыю ААТ «Гродна Азот» ведаюць ва ўсім свеце. На Радзіме — таксама: без яе не абыходзяцца ні буйныя сельгаспрадпрыемствы, ні дачнікі на сваім участку. Азотныя ўгнаенні — аснова ўраджаю. Ад іх якасці, збалансаванасці, разнастайнасці ў прызначэнні ў многім залежыць харчовая бяспека краіны, а значыць, без перабольшвання, — якасць жыцця людзей.

СТАР. 8–9





ЗАЦВЕРДЖАНА КАНЦЭПЦЫЯ ІНЖЫНЕРНАЙ АДУКАЦЫІ 4–5



КАНАЛЫ ДАБРАБЫТУ 6–7

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

25105>

СОЦЫУМ

## АЗДАРАЎЛЕННЕ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ — САМАЕ ДАСТУПНАЕ

**Адпачынак з дзяржпадтрымкай**

У Беларусі дзяржава ўдзяляе вялікую ўвагу аздараўленню — як дзяцей, так і дарослых. Толькі летась на тых, хто мае патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні, было выдаткавана каля 252 мільёнаў рублёў. Дзякуючы гэтаму бясплатнымі пуцёўкамі, а таксама пуцёўкамі з датацыямі было забяспечана 807 тысяч чалавек. Прыярытэтам у аздараўленні з'яўляюцца дзеці — больш за 70 % тых сродкаў было выдаткавана на пуцёўкі ў лагеры і дзіцячыя санаторыі. Летам школьнікаў прымуць каля 6 тысяч аб'ектаў адпачынку і аздараўлення, а гэта 4,5 тысячы лагераў з дзённым знаходжаннем і каля 1,5 тысячы лагераў з кругласутачным знаходжаннем. У Беларусі таксама функцыянуе 148 паўнацэнных стацыянарных загарадных лагераў.

СТАР. 12



АФІЦЫЙНА

# ПРЭЗІДЭНТ ЗНАХОДЗІЦЦА З ВІЗІТАМ У КІТАІ

**У КНР Аляксандр ЛУКАШЭНКА прыбыў учора позна ўвечары па мясцовым часе**

Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара, візіт будзе доўжыцца 2—4 чэрвеня. У Пекіне пройдзе традыцыйная дружалюбная сямейная сустрэча беларускага лідара са Старшынёй КНР. Спачатку ў фармаце «адзін на адзін», а затым у нефармальнай абстаноўцы Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін, як плануецца, абмяркуюць стан і перспектывы развіцця беларуска-кітайскіх адносін, іх максімальнае напаўненне практычным зместам за кошт рэалізацыі сумесных праектаў і пашырэння шматбаковых ініцыятыў. У цэнтры ўвагі будуць таксама пытанні міжнароднага супрацоўніцтва. Праграмай візіту запланаваны і шэраг іншых перагавораў і сустрэч.

# ШЛЯХАМ «ЖАЛЕЗНАГА

## Беларусь і Кітай умацоўваюць

Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітайскую Народную Рэспубліку і фармат сустрэч на найвышэйшым узроўні — яскравае адлюстраванне стратэгічнага партнёрства дзвюх дзяржаў, якое насамрэч стала ўзорам новага тыпу міжнародных адносін. Пад стратэгічным кіраўніцтвам лідараў дзвюх краін традыцыйнае сяброўства ўмацоўваецца з кожным днём, няўхільна пашыраецца супрацоўніцтва ў розных галінах, наладжана прадукцыйнае ўзаемадзеянне па актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня.

### УЗОР САЛІДАРНАСЦІ І ЎЗАЕМАДАВЕРУ



«Мы ўсепагодныя і ўсебаковыя стратэгічныя партнёры, — падкрэсліў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Вэньчуань** падчас афіцыйнага адкрыцця фестывалю «Чай для гармоніі міру», які прайшоў днямі ў беларускай сталіцы. — Кітай гатовы разам з Беларуссю пісаць новыя старонкі сучаснай гісторыі, умацоўваць гуманітарныя сувязі і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва, сумесна будаваць Супольнасць адзінага лёсу чалавецтва».

Як адзначыў у інтэрв'ю «Звяздзе» кіраўнік дыпламатычнай місіі, «пад стратэгічным кіраўніцтвам Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўсепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства паміж Кітаем і Беларуссю развіваецца імклівымі тэмпамі і становіцца ўзорам новага тыпу міжнародных адносін. Гэта ўзор узаемнага ўмацавання салідарнасці і ўзаемадаверу.

Нягледзячы на тое, што Кітай і Беларусь знаходзяцца за тысячы кіламетраў адзін ад аднаго і адрозніваюцца культурай і дзяржаўным ладам, абедзве краіны прытрымліваюцца шляху развіцця, які адпавядае іх уласным нацыянальным умовам, і развіваюць міжнародныя адносіны ў адпаведнасці з прынцыпамі незалежнасці, узаемнай роўнасці і ўзаемнай выгады.

Цесныя кантакты на высокім узроўні паміж Кітаем і Беларуссю вызначаюць высокі ўзровень палітычнага ўзаемадаверу і садзейнічаюць усебаковаму развіццю кітайска-беларускіх адносін, што ўяўляе сабой кансэнсус, дасягнуты абодвума бакамі са стратэгічнай вышыні і ў доўгатэрміновай перспектыве.

Гэта ўзор няўхільнага прытрымлівання правільнага шляху і ўдзелу ў глабальным кіраванні. З'яўляючыся важнымі членамі шматбаковых арганізацый, такіх як Арганізацыя Аб'яднаных Нацый і Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, Кітай і Беларусь цвёрда падтрымліваюць адзін аднаго па пытаннях, якія закранаюць іх карэнныя інтарэсы і важныя заклапочанасці, адданы падтрыманню аанацэнтрычнай міжнароднай сістэмы і міжнароднага парадку, заснаванага на міжнародным праве.

Гэта ўзор прасоўвання прагматычнага супрацоўніцтва на ўзаемавыгаднай і ўзаемавыйгрышнай аснове. Акрамя супрацоўніцтва ў сферы фінансаў, сельскай гаспадаркі, машынабудавання, апошнія гады Кітай і Беларусь таксама інтэнсіўна развіваюць узаемадзеянне ў галіне медыцыны і аховы здароўя, гандлю паслугамі, лічбавай эканомікі, высокіх тэхналогій і іншых сферах, і патэнцыял для двухбаковага супрацоўніцтва яшчэ больш раскрываецца, а эканамічныя і сацыяльныя выгады становяцца ўсё больш адчувальнымі.

Гэта ўзор дакладнага і моцнага сяброўства, якое перадаецца з пакалення ў пакаленне. Сяброўства паміж кітайскім і беларускім народамі, якое змацавана крывёй падчас Другой сусветнай вайны, стала мацнейшым у перыяд барацьбы з эпідэміяй Covid-19 і ўкаранілася ў свядомасці людзей дзякуючы частым візітам і падтрыманню блізкіх адносін. Пры дбайным клопаце з абодвух бакоў закладзена трывалая і глыбокая аснова кітайска-беларускіх адносін для яшчэ большага росту і дасягнення высокіх вынікаў у будучыні».




### ПА ЎЗЫХОДЗЯЧАЙ ТРАЕКТОРЫІ

Адносіны Беларусі і Кітая развіваюцца па ўзыходзячай траекторыі, нягледзячы на глабальную турбулентнасць і ўсе цяжкасці. Такое меркаванне выказаў **першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ** падчас сустрэчы з намеснікам прэм'ер-міністра Дзяржаўнага савета КНР Лю Гачжунам. «Нягледзячы на нелегітымныя санкцыі заходніх краін да нашай дзяржавы, мы штогод дасягаем рэкордных паказчыкаў двухбаковага абароту. За апошнія пяць гадоў ён вырас удвая і летась склаў $8,6 млрд», — адзначыў першы віцэ-прэм'ер.



Беларусь паступальна прасоўвае свой удзел у ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях». «Наш сумесны праект — Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» — адзін з самых маштабных у рэалізацыі гэтай глабальнай ініцыятывы, — прывёў прыклад Мікалай Снапкоў. — Сумесныя дасягненні нашых краін адпавядаюць устаноўленым планам на ўзроўні ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага прагнозу. Галоўная задача — развіццё прадукцыйных сіл новай якасці, стварэнне сумесна новых галін прамысловасці і мадэрнізацыя дзейных.

Мікалай Снапкоў падкрэсліў, што бакам як ніколі важна прадэманстраваць усяму свету моц і непарушнасць беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, цвёрды курс на захаванне агульнай гістарычнай памяці.

Гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ўмацоўваецца па ўсіх кірунках. Аб гэтым заявіў **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР**. Ён адзначыў, што Кітай на працягу апошніх пяці гадоў з'яўляецца другім гандлёвым партнёрам Беларусі, а наша краіна ўваходзіць у дзясятку найбуйнейшых пастаўшчыкоў у КНР калійных угнаенняў, мяса-малочнай прадукцыі, рапсавага алею, гатовая і ўдалейшым нарошчваць аб'ёмы экспарту. «Урадам намечана каля 70 патэнцыяльных сумесных праектаў па прамысловым і тэхналагічным супрацоўніцтве з Кітаем. Прыярытэтныя сферы: аўтамабіле- і машынабудаванне, станка- і прыборабудаванне, оптыка і электроніка, фармацэўтыка і іншыя».



Беларусь і Кітай выбудоўваюць усебаковае супрацоўніцтва на аснове ўзаемнай павагі. Аб гэтым заявіла **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ**. «У нас вельмі шчыльнае і доўгае сяброўства, — адзначыла яна. — Нас аб'ядноўвае ўсё — і эканоміка, і сяброўства, і ўзаемапавага. І, вядома ж, мы ідзём поруч ужо многія гады, вырашаем сумесныя пытанні». Надзея Лазарэвіч нагадала аб шэрагу інфраструктурных аб'ектаў, пабудаваных у Мінску пры падтрымцы кітайскага боку: «З удзелам кіраўніка дзяржавы быў адкрыты плавальны басейн. Мы чакаем у хуткай будучыні адкрыцця і футбольнага манежа». Першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама таксама адзначыла рост цікавасці кітайскага бізнесу да Беларусі.



**Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Анастасія САВІНЫХ** у эфіры СТБ згадала пра тое, што Пекін і Мінск злучылі рэгулярныя чыгуначныя зносіны ў рамках грузаперавозак Кітай — Еўропа. «Вельмі добрая навіна. Гэта дапаможа развіццю і павелічэнню тавараабароту. Састаў





# БРАТЭРСТВА»



## стратэгічнае партнёрства

кансалідуе грузы з эканамічнага трохвугольніка Пекін — Цяньцзінь — Хэбэй. Агульная колькасць насельніцтва гэтага рэгіёна перавышае 110 мільёнаў чалавек, што на парадак вышэй за насельніцтва буйных еўрапейскіх краін, — падкрэсліла эксперт. — Менавіта таму для нас гэты рэгіён будзе вельмі перспектыўны з пункту гледжання продажу туды беларускай прадукцыі, у тым ліку якасных харчовых беларускіх прадуктаў».

### НАДЗЕЙНАЯ АСНОВА

Як адзначыў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр ГАРОШКІН**, візіт кіраўніка нашай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай з'яўляецца знакавай падзеяй, якая падкрэслівае глыбіню і шматграннасць беларуска-кітайскіх адносін на сучасным этапе. «Фармат «сяброўскай сямейнай сустрэчы» сведчыць аб высокім узроўні даверу і ўзаемаразумення паміж лідарамі дзвюх дзяржаў, — падкрэсліў ён. — Гэты дыялог набывае асаблівую важнасць у кантэксце сучасных геапалітычных выклікаў.



Беларусь, знаходзячыся ў эпіцэнтры еўрапейскіх падзей, мае патрэбу ў надзейных стратэгічных партнёрах, здольных аказаць падтрымку ў розных сферах. Кітай, у сваю чаргу, бачыць у Беларусі стабільнага і прадказальнага партнёра ў еўрапейскім рэгіёне.

Сенатар звярнуў увагу на тое, што перспектывы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва вялікія: «Акрамя традыцыйных сфер, такіх як гандаль і інвестыцыі, адкрываюцца новыя магчымасці ў галіне высокіх тэхналогій, лічбавай эканомікі і інавацый. Сумесныя праекты ў гэтых сферах могуць стаць драйверамі эканамічнага росту Беларусі і садзейнічаць павышэнню яе канкурэнтаздольнасці на сусветным рынку».

Аляксандр Гарошкін адзначыў, што беларуска-кітайскае супрацоўніцтва мае ўзаемавыгадны характар: «Беларусь атрымлівае доступ да кітайскіх тэхналогій і інвестыцый, а Кітай — да лагістычных магчымасцяў і кваліфікаванай рабочай сілы. Гэта стварае трывалую аснову для далейшага развіцця стратэгічнага партнёрства і ўмацавання сяброўства паміж двума народамі».

Вядучую ролю ў паступальным і стабільным развіцці двухбаковых адносін адыграла менавіта дыпламатыя кіраўнікоў дзяржаў, якая таксама забяспечыла надзейную палітычную аснову для далейшага пашырэння практычнага супрацоўніцтва, лічыць **член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Віктар АЗАРОНАК**: «Папярэдняя сустрэча двух лідараў адбылася ў лютым—сакавіку 2023 года. Яе вынікам стала падпісанне каля 40 пагадненняў і кантрактаў на агульную суму 3,5 мільярда долараў. У рамках маючай адбыцца сустрэчы плануецца абмеркаванне стану і перспектыў развіцця беларуска-кітайскіх адносін, якія на сённяшні дзень маюць вялікі патэнцыял».



Як адзначыў **дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ**, візіт беларускага лідара ў Кітай нікогда не павінен здзіўляць, бо паміж нашымі дзяржавамі наладжаны фармат усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. «Гэта вельмі высокі ўзровень, якім валодае невялікая колькасць краін, — удакладніў ён. — Таму з афіцыйнага пункту гледжання візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай з'яўляецца адпрацоўкай нашага ўзаемадзеяння з гэтай краінай».



Аляксей Бяляеў звярнуў увагу на важнасць адносін асабістага характару паміж лідарамі двух дзяржаў. «Аляксандра Лукашэнку і Сі Цзіньпіна звязваюць не проста сяброўскія, а вельмі цёплыя адносіны, — канкрэтызаваў дэкан факультэта журналістыкі БДУ. — Іх сустрэчы — гэта сустрэчы старых добрых сяброў, што вельмі многае значыць з пункту гледжання ўсходняй дыпламатыі. На Усходзе неахвотна выходзяць за рамкі афіцыёзу, калі не адчуваюць пэўных цёплых пачуццяў і сур'ёзных намераў у супрацоўніцтве. Таму гэта двайны паказчык таго, што адносіны Беларусі і Кітая сёння знаходзяцца на ўзлёце, і гэтаму складана перашкодзіць».

З іншага боку, па словах палітолага, беларуска-кітайскім адносінам яшчэ ёсць куды развівацца. Ён выказаў меркаванне, што візіт нашага Прэзідэнта ў Кітай звязаны ў тым ліку і з пашырэннем гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, а таксама з пэўнай напружанасцю, якая цяпер складваецца ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне. «Паколькі Кітай і Злучаныя Штаты Амерыкі сёння знаходзяцца ў стане сур'ёзнага эканамічнага канфлікту, ёсць паміж імі і палітычная напружанасць, Кітаю сёння патрабуецца падтрымка на міжнародных пляцоўках, — адзначыў Аляксей Бяляеў. — Беларусь заўсёды гатова яе аказаць. Ва ўмовах працягу ўкраінскага канфлікту шэраг краін глядзіць на тое, як ён можа быць урэгуляваны. І тут і Беларусь, і Кітай маюць сваю зацікаўленасць у як мага хутчэйшым завяршэнні гэтага канфлікту, ва ўстанаўленні трывалага міру для таго, каб не толькі ўзмацнілася супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, а каб яно пашырылася. Ініцыятыва Кітая «Адзін пояс — адзін шлях» акурат накіравана на тое, каб аб'ядноўваць краіны, кантыненты, каб стварыць вялікае кола еўразійскага гандлю. Гэтаму, вядома, перашкаджаюць канфлікты. Кітай імкнецца да іх завяршэння. Беларусь з'яўляецца прыхільнікам такой пазіцыі».

АКТУАЛЬНА

## СТРАТЭГІІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

### Якія дадатковыя магчымасці для эканамічнага росту?

**У Доме ўрада ў суботу, 31 мая, адбылася сустрэча Прэм'ер-міністра Аляксандра ТУРЧЫНА з доктарам эканамічных навук, дэканам эканамічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава Аляксандрам Аўзанам.**

У цэнтры ўвагі — тэма дадатковых магчымасцяў для эканамічнага росту. У сустрэчы таксама ўзялі ўдзел Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой, міністр эканомікі Юрый Чабатар і дырэктар БІСД Алег Макараў.

Як адзначыў Аляксандр Турчын, сусветная эканоміка запавольваецца, прагнозы па ёй пераглядаюцца ў песімістычны бок.

У той жа час у Беларусі сёння ідзе распрацоўка праграмных дакументаў на пяцігодку, стратэгіі ўстойлівага развіцця, і меркаванне аўтарытэтнага госця, яго экспертная ацэнка плюсоў і мінусаў развіцця беларускай эканомікі будзе вельмі дарэчнай.

— Таму пошук новых пунктаў росту ўяўляе для нас першачарговую задачу. Разлічваем, што ў рамках нашай сустрэчы будуць выпрацаваны прапановы стратэгічнага характару і навукова абгрунтаваныя ідэі, якія могуць быць пакладзены ў аснову эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у новай пяцігодцы, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр.

## У тэму



**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Кітаі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** адзначыў, што да прыезду кіраўніка дзяржавы была праведзена сістэмная і вельмі вялікая работа на ўзроўні ўрадаў дзвюх краін, паведаміла БелТА. Гэта ў тым ліку візіты ў Беларусь прэм'ера Дзяржсавета КНР у 2024 годзе, а таксама нядаўняе пасяджэнне ў Мінску беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта на ўзроўні віцэ-прэм'ераў.

«Выразна абазначаны ключавы вектар — мадэрнізацыя нашай эканомікі на аснове кітайскіх тэхналогій. Гэты імпульс у далейшым атрымаў развіццё ў падпісаных ключавых дакументах паміж нашымі прамысловымі міністэрствамі, дзе была вызначана стратэгія развіцця прамысловага комплексу на найбліжэйшую пяцігодку. Таксама абазначаны найважнейшыя праекты развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў машынабудаванні, дрэваапрацоўцы, хімічнай прамысловасці і гэтак далей. Комплекс пытанняў, які яшчэ ў мінулым годзе ляжаў на паперы, сёння пачынае рэалізоўвацца ў практычных дзеяннях», — расказаў пасол.

Паводле яго слоў, візіт Прэзідэнта ў Кітай — гэта ў тым ліку магчымасць атрымаць ацэнку і падвесці прамежкавыя вынікі работы ўрадаў па развіцці супрацоўніцтва. Размова ў цэлым ідзе аб сумеснай рабоце па фарміраванні эканомікі інавацый і ведаў: «Сёння Кітай выбраў стратэгію развіцця прадукцыйных сіл новай якасці. Яны заснаваны на інавацыях, лічбавых платформах. Такім чынам, грунтуючыся на кітайскіх тэхналогіях, мы тым самым пераносім гэтыя інавацыйныя падыходы і ў сваю эканоміку. Кітайскі бок усяляк падтрымлівае нашы ініцыятывы, і мы бачым іх адкрытасць у доступе і ў пошуку новых кірункаў. Мы працуем не толькі ў галіне прамысловасці, але і ў адукацыі, медыцыне, лагістыцы і гэтак далей».

Аляксандр Чарвякоў звярнуў увагу, што аснова інавацый пачынаецца з адукацыі і ў гэтым плане ёсць добрыя прыклады развіцця міжуніверсітэцкага ўзаемадзеяння, у тым ліку ў кірунку фундаментальных навуковых даследаванняў. «Гэта хімія, фізіка, новыя матэрыялы, біялогія і біяхімія. У гэтым кірунку мы разам з Кітаем рухаемся і бачым іх зацікаўленасць у сумеснай рабоце», — сказаў пасол.

Што да ўзаемнага гандлю, то тавараабарот сёлета па выніках першага квартала значна вырас, у тым ліку прыкладна на 18 % дадаў беларускі экспарт. Традыцыйныя беларускія пазіцыі ў пастаўках на кітайскі рынак — харчовая прадукцыя, калійныя ўгнаенні, прадукцыя дрэваапрацоўкі. «Мы бачым новыя таварныя пазіцыі, якія неабходна адкрываць, і з якімі цяпер актыўна працуюць нашы дзяржорганы па адкрыцці і прадпрыемстваў, і новых прадуктаў. Таму патэнцыял ёсць, перспектывы вялікія. Кітай для нас як быў, так і застаецца ключавым усепагодным стратэгічным партнёрам», — заявіў пасол.






# ПРАФЕСІЯ — ІНЖЫНЕР. І ГЭТА ГУЧЫЦЬ ГОРДА

## Сёння каля 20 ВНУ краіны рыхтуюць інжынераў па больш чым 100 спецыяльнасцях



Урад не так даўно зацвердзіў Канцэпцыю развіцця інжынернай адукацыі ў Беларусі на перыяд да 2035 года. Павышэнне якасці падрыхтоўкі інжынерных кадраў і забеспячэнне тэхналагічнай бяспекі краіны — асноўная мэта распрацоўкі і прыняцця дакумента. Пра тое, што ўжо зроблена і як будуць далей рэалізоўвацца маштабныя ініцыятывы, выкладзеныя ў канцэпцыі, расказвае першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр БАХАНОВІЧ.

### У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

***— Аляксандр Генадзьевіч, вядома, што яшчэ да зацвярджэння канцэпцыі былі сур'ёзныя крокі па папулярызацыі прафесіі інжынера.***

— Навукова-тэхнічны і прамысловы патэнцыял Беларусі развіваецца, таму пытанні высакаякаснай падрыхтоўкі інжынерных кадраў заўсёды знаходзяцца ў цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы і ўрада. Міністэрства адукацыі сумесна з усімі зацікаўленымі вырашае гэту важную задачу на ўсіх этапах падрыхтоўкі спецыялістаў. Сёння каля 20 ВНУ краіны рыхтуюць інжынераў па больш чым 100 спецыяльнасцях. Пачынаючы са школьных гадоў мы выяўляем і падтрымліваем дзяцей, якія цікавяцца тэхнічнай дзейнасцю, ствараем для іх адпаведную матэрыяльную базу і прыцягваем вопытных педагогаў-настаўнікаў з каледжаў і універсітэтаў. Яскравы прыклад таму —паспяховае функцыянаванне Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, у якім па 15 сучасных кірунках інжынернага профілю штогод займаюцца звыш 1,5 тысячы навучэнцаў 9—11-х класаў. Выпускнікі тэхнапарка, якія паспяхова прайшлі навучанне, маюць правы паступлення ў ВНУ без уступных іспытаў на 196 спецыяльнасцяў.

Намі распрацавана і рэалізоўваецца праграма стварэння ў школах інжынерна-тэхнічных цэнтраў, якія аснашчаюцца сучасным даследчым абсталяваннем. Сёння такіх цэнтраў у нас — 175.

З 2023/2024 навучальнага года адкрыта падрыхтоўка школьнікаў у профільных класах (групах) інжынернай накіраванасці на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі. У 580 інжынерных класах праходзіць навучанне каля 6,5 тысячы школьнікаў. Першыя выпускнікі інжынерных класаў, а гэта 2,5 тысячы чалавек, змогуць паступіць у ВНУ па сумоўі на найбольш запатрабаваныя эканомікай інжынерныя і педагагічныя спецыяльнасці ўжо сёлета.

Істотна пашырана практычная падрыхтоўка будучых інжынераў на базе філіялаў кафедраў на вядучых прадпрыемствах краіны. Да працэсу прыцягваюцца вопытныя спецыялісты-практыкі, ствараюцца неабходныя вытворчыя, фінансавыя і сацыяльна-бытавыя ўмовы для замацавання маладых спецыялістаў на першых працоўных месцах.

### ЗАКАСАЎШЫ РУКАВЫ

***— Перыяд рэалізацыі канцэпцыі — 10 гадоў. Тэрмін сур'ёзны. Міністэрства адукацыі выступае каардынатарам гэтай работы. За што плануеце ўзяцца ў першую чаргу?***

— Мы ўжо рэалізоўваем шэраг мерапрыемстваў канцэпцыі. Да наяўных трох цэнтраў кампетэнцый у БДУІР, БрДТУ і БДАС у найбліжэйшыя гады плануем дадаць яшчэ 9, у якіх па сеткавай форме пройдуць навучанне ўсе студэнты інжынерных спецыяльнасцей. Сёння мы працягваем работу з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў па адкрыцці на іх базе навучальных цэхаў, майстэрняў і ўчасткаў (іх запланавана адкрыць не менш за 70). Далей прыступаем да стварэння студэнцкіх канструктарскіх бюро ў ВНУ, дзе будуць вырашацца актуальныя інжынерна-тэхнічныя задачы прадпрыемстваў. Сумесна з зацікаўленымі арганізацыямі вызначаем кірункі падрыхтоўкі інжынераў па новых сумежных спецыяльнасцях.

### АРЫЕНЦІР — НА ПРАКТЫКУ

***— Значнае месца ў дакуменце адведзена арганізацыі вытворчай практыкі на прамысловых прадпрыемствах. Як гэта ўзаемадзеянне наладжана сёння і ў якіх кірунках будзеце рухацца далей?***

— На сёння амаль па ўсіх спецыяльнасцях практыкі праводзяцца ўжо з першага курса. Прадпрыемствы імкнуцца арганізаваць практычную частку навучання на высокім узроўні: за студэнтамі замацоўваюцца вопытныя настаўнікі; пры магчымасці навучэнцы падчас практыкі працаўладкоўваюцца на пасады з гарантаванай заработнай платай, што становіцца адбіваецца на іх далейшай прафесійнай будучыні.

Канцэпцыяй таксама прадугледжаны шэраг мерапрыемстваў, якія дазваляюць моладзі атрымаць рабочую прафесію ў ВНУ. Адпаведныя карэкціроўкі ўносяцца ў навучальныя планы і праграмы практык. Станоўчы вопыт падрыхтоўкі студэнтаў па рабочых прафесіях ужо ўкаранёны ў аграрных ВНУ. Плануем выкарыстоўваць гэтыя напрацоўкі пры падрыхтоўцы спецыялістаў для арганізацый Мінэнерга, канцэрна «Белнафтахім» і іншых.

### І ІНЖЫНЕРЫ, І АЙЦІШНІКІ

***— Часта даводзіцца чуць пра тое, што сёння спецыялістаў інфармацыйных тэхналогій рыхтуюць у два разы больш, чым патрэбна...***

— План набору на любую спецыяльнасць штогод зацвярджаецца выключна на падставе перспектыўнай патрэбы заказчыкаў кадраў. Што датычыцца спецыялістаў з кампетэнцыямі ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, то яны запатрабаваны ўсімі галінамі эканомікі і сацыяльнай сферы. Інжынерныя кадры не выключэнне, бо сёння любую сучасную вытворчасць немагчыма ўявіць без інфармацыйных тэхналогій. Таму па ўсіх інжынерных спецыяльнасцях студэнты атрымліваюць веды ў галіне лічбавізацыі вытворчых працэсаў, эфектыўнага выкарыстання сучасных праграмных прадуктаў, тэхналогій штучнага інтэлекту і іншых у неабходным аб'ёме.

### ТЭХНІЧНЫ, ЗНАЧЫЦЬ — ТЭХНІЧНЫ

***— У свой час Прэзідэнт указаў на неабходнасць адмаўляцца ад няпрофільнай падрыхтоўкі ў тэхнічных ВНУ...***

— Міністэрства адукацыі разам з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і заказчыкамі кадраў правялі сістэмную работу па аптымізацыі структуры набору з улікам профілю ўніверсітэтаў. У выніку сёння спынены прыём студэнтаў па 50 няпрофільных спецыяльнасцях у 20 ВНУ. Работа па выключэнні няпрофільнай падрыхтоўкі будзе завершана ў надыходзячым навучальным годзе. Таксама скарэкціраваны падыходы па навучанні выпускнікоў каледжаў на скарочанай форме атрымання вышэйшай адукацыі.

### І ВЫТВОРЦА, І ВЫКЛАДЧЫК

***— У канцэпцыі немалое значэнне надаецца пытанню ўключэння ў адукацыйны працэс арганізацый-заказчыкаў. Ці ёсць такі досвед у краіне?***

— Ёсць, і апошнім часам удзел арганізацый — заказчыкаў кадраў у навучальным працэсе прыкметна актывізаваўся. Сталі часцей праводзіцца прафарыентацыйныя мерапрыемствы ў ВНУ, каледжах і школах. Вядучыя спецыялісты ўстаноў і прадпрыемстваў, акрамя арганізацыі і

# ШЛЯХ У СВЕТ НАВУКІ

## Як Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы працуе з інжынернымі класамі

У сучасным свеце, дзе тэхналогіі адыгрываюць ключавую ролю, інжынерная адукацыя становіцца неад'емнай часткай стварэння будучыні. Адкрыццё профільных класаў у школах Беларусі — важны крок у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных паспяхова вырашаць складаныя тэхнічныя і інавацыйныя задачы. Пагаварылі з першым прарэктарам ГрДУ імя Янкі Купалы Аляксандрам КАРЭЎСКІМ аб тым, як універсітэт працуе з інжынернымі класамі і які ўнёсак робіць у развіццё тэхнічных спецыяльнасцяў.

— Мы вельмі чакаем у шэрагах сваіх студэнтаў выпускнікоў інжынерных класаў. Сёлета адбудзецца першы выпуск, але ўніверсітэт мае вялікі досвед работы з педагагічнымі класамі, таму дадзеная траекторыя паступлення для нас не ў навінку. Тыя выпускнікі, што прыходзяць з профільных класаў, максімальна замотываваны і дакладна ведаюць, чым хочуць займацца. А калі студэнт вучыцца на спецыяльнасці, што яму па душы, то і якасць адукацыі дакладна будзе высокай, — сказаў Аляксандр Карэўскі.



Выпускнікі профільных класаў інжынернай накіраванасці могуць паступаць на наступныя спецыяльнасці ГрДУ: «Фізіка», «Робататэхнічныя сістэмы», «Тэхналогія машынабудавання, металарэжучыя станкі і інструменты», «Эксплуатацыя наземных транспартных і тэхналагічных машын і комплексаў», «Інфармацыйна-вымяральныя прыборы і сістэмы», «Вытворчасць прадукцыі і арганізацыя грамадскага харчавання», «Узвядзенне будынкаў і збудаванняў».

— У Купалаўскім універсітэце праводзіцца сістэматычная і мэтанакіраваная прафарыентацыйная работа з навучэнцамі 9—11 класаў і выпускнікамі каледжаў. Гэта самыя розныя формы. Створаны Тэлеграм-канал «Стань інжынерам у ГрДУ!», — расказаў першы прарэктар. — На падставе праграмы ўзаемадзеяння галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта ў рамках абласнога адукацыйнага кластара за факультэтамі ўніверсітэта замацаваны 98 класаў інжынернай накіраванасці, у якіх навучаецца 1125 школьнікаў з 66 устаноў адукацыі.

Работа з інжынернымі класамі вядзецца на самых розных узроўнях, бо папулярызацыя тэхнічнай адукацыі — комплекснае пытанне. Заключаны чатырохбаковы дагавор аб супрацоўніцтве паміж ГрДУ імя Янкі Купалы, аддзелам адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Гродна, СШ № 39 імя І. Д. Лебедзева горада Гродна і Гродзенскім рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам электраэнергетыкі «Гродназнерга».

— Акрамя таго, заключаны трохбаковы дагавор аб супрацоўніцтве паміж Купалаўскім універсітэтам, гімназіяй № 9 імя Ф. П. Кірычэнкі горада Гродна і філіялам «Гродзенскія цеплавыя сеткі» «РУП «Гродназнерга», — паведаміў Аляксандр Карэўскі. — У цэлым заключана 10 дагавораў аб арганізацыі работы інжынерных класаў. Абавязкова прыцягваем прадпрыемствы і арганізацыі вобласці, бо важна, каб дзеці на прыкладзе спецыялістаў, якія ўжо дабіліся прафесійных поспехаў, бачылі, як можа скласціся іх кар'ерны шлях у інжынернай сферы.

Ва ўніверсітэце існуюць і іншыя формы ўзаемадзеяння. Так, сумесна з Гродзенскай гарадской гімназіяй імя А. І. Дубко праводзяцца факультатыўныя заняткі «У свеце тэхнікі і тэхналогій: выбіраем інжынерную прафесію». На фізіка-тэхнічным факультэце для ажыццяўлення навуко-

правядзення практык, кіруюць курсавымі, дыпломнымі праектамі і работамі, удзельнічаюць у дзяржаўных экзаменацыйных камісіях і нават узначальваюць іх. Карысным вопытам з'яўляецца і арганізацыя стажыровак выкладчыкаў ВНУ на прадпрыемствах.

Канцэпцыяй вызначаны новы кірунак узаемадзеяння вышэйшай тэхнічнай адукацыі з рэальным сектарам эканомікі — гэта непасрэдны фінансавы і арганізацыйна-тэхнічны ўдзел прадпрыемстваў у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы цэнтраў кампетэнцый ВНУ. Для вырашэння дадзенай ключавой задачы распрацаваны адпаведны комплекс мер на 2025—2030 гады.

## СА ШКОЛЬНАЙ ПАРТЫ

***— Як у далейшым плануецца выкарыстоўваць вопыт інжынерных класаў?***



— Асаблівасць падрыхтоўкі навучэнцаў у інжынерных класах — іх замацаванне за канкрэтнай тэхнічнай ВНУ, выкладчыкі якой бяруць непасрэдны ўдзел у навучанні школьнікаў, а таксама праводзяць з імі прафарыентацыйную работу ў прывязцы да свайго рэгіёна. Такім чынам навучэнцы інжынерных класаў знаёмяцца з прамысловым патэнцыялам вобласці і горада, наведваюць вядучыя прадпрыемствы, і гэта павышае як матывацыю, так і ўсвядомленасць выбару спецыяльнасці і ВНУ.

У планах — зрабіць паглыбленую прафілізацыю інжынерных класаў, прывязаўшы яе да профілю курыруючай тэхнічнай ВНУ, і адпаведным чынам напоўніць праграму факультатыўнага курса.

***— Якія інжынерныя спецыяльнасці папулярныя сярод цяперашніх абітурыентаў і якія кірункі адкрыюцца ў перспектыве?***

— Сёння ўсе інжынерныя спецыяльнасці запатрабаваныя рынкам працы. Тым не менш параю: не трэба выбіраць спецыяльнасць толькі таму, што яна гучна або модна гучыць. Важна ўсё асэнсаваць і памятаць, што выбіраеш справу свайго жыцця.

Што датычыцца адкрыцця новых спецыяльнасцяў, то яно адбываецца, зыходзячы з патрэбы ў кадрах. Напрыклад, сёлета ВНУ ўпершыню будуць ажыццяўляць набор на інжынерныя спецыяльнасці: «Праектаванне і тэхналогія беспілотных авіяцыйных комплексаў», «Звышвысокачастотныя сістэмы», «Хімічная тэхналогія энерганасычаных матэрыялаў» і іншыя.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА і з адкрытых крыніц.**

УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ — 2025

# ВЕДЫ, РУЧКА І ДАКУМЕНТ

## Учора ў 40 пунктах правядзення ЦТ пісалі тэсты каля 32,7 тысячы абітурыентаў

Моладзь праходзіла тэсціраванне па матэматыцы, біялогіі, замежнай мове (англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай і кітайскай), геаграфіі, сусветнай гісторыі (найноўшы час), гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі.

Як паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК**, сярод абітурыентаў, якія праходзілі тэсціраванне, былі як выпускнікі школ гэтага года, так і мінулых гадоў.

— І першыя, і другія ўжо здалі па два іспыты: першы профільны прадмет на выбар і адну з дзяржаўных моў. Другі профільны прадмет у форме ЦТ здавалі ўчора ці яшчэ будуць здаваць 5 чэрвеня, — канстатаваў ён.

Дырэктар РІКВ яшчэ раз нагадаў, што павінен мець пры сабе ўдзельнік ЦТ і чаго ў яго быць не павінна.

— Удзельнік ЦТ павінен прыбыць у пункт правядзення, маючы пры сабе пропуск, дакумент, які сведчыць асобу (пашпарт, ID-карта (пластыкавая смарт-карта), від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанне бежанца, даведка, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента, які сведчыць асобу), ручку (гелевую або капілярную) з чарнілам чорнага колеру, — пералічвае Юрый Міксюк. — Дазваляецца таксама мець пры сабе калькулятар пры напісанні тэста па хіміі і фізіцы.

Ён засяродзіў увагу на тым, што ўдзельнікі цэнтралізаванага тэсціравання, якія раней не зарэгістраваліся, і тыя, хто не мае пры сабе дакумента, што сведчыць асобу, да праходжання тэстаў не дапускаюцца. Упусцяць свой шанц і тыя, хто прыбыў на тэсціраванне пасля распячатвання пакета з экзаменацыйнымі работамі.

Рэзервовымі днямі для ЦТ вызначаны 19-га, 21-га, 23 чэрвеня. Зарэгістравацца на іх можна будзе з 9 да 12 чэрвеня. Інфармацыю аб выніках ЦТ можна будзе атрымаць на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Сертыфікаты ЦТ будуць выдавацца з 1 ліпеня.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

ва-даследчай дзейнасці студэнтаў і школьнікаў створаны навуковыя гурткі: «Камп'ютарнае мадэляванне фізічных і тэхналагічных працэсаў», «Праектаванне», «Робататэхніка і аўтаматыка». Таксама працуюць навукова-даследчая лабараторыя «Нанафатоніка» і студэнцкае канструктарскае бюро «Практычная электроніка».

— Вельмі добра сябе зарэкамендавала правядзенне шматпрофільнай летняй школы «Купалаўскі старт» для навучэнцаў інжынерных класаў і класаў педагагічнай накіраванасці, — падзяліўся суразмоўца. — Традыцыйна да нас прыязджаюць вучні з сярэдняй школы № 7 горада Ваўкавыска. Выпрабавалі выязны фармат школы. Рэалізоўваецца праект «PROF-канікулы»: восеньскі, зімовы і вясновы сезоны. Адкрыта і актыўна працуе прастора па інтарэсах тэхнічнага профілю «Саюз тэхнікі і творчасці» для навучэнцаў інжынерных класаў.

У рамках праекта «Універсітэцкая субота» праходзяць экскурсіі ў Навукова-тэхналагічны парк ГрДУ імя Янкі Купалы, студэнцкае канструктарскае бюро фізіка-тэхнічнага факультэта, у навучальныя лабараторыі ўніверсітэта і на прадпрыемствы. Арганізоўваюцца анлайн-лекцыі, майстар-класы, практычныя і лабараторныя заняткі, а таксама тэст-драйв прафесіі «Інжынер-праграміст».

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

## У тэму

**Рэктар Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Міхаіл ЛУСЦЯНКОЎ:**

«Беларуска-Расійскі ўніверсітэт ужо больш за 60 гадоў рыхтуе інжынерныя кадры. З мэтай папулярызацыі інжынернай адукацыі з 2023 года ВНУ адчыніла свае дзверы для навучэнцаў інжынерных класаў як горада Магілёва, так і Магілёўскай вобласці. Наведванне факультатыўных заняткаў «У свеце тэхнікі і тэхналогій» дазваляе школьнікам азнаёміцца з сучаснымі кірункамі інжынерыі, атрымаць уяўленне аб прафесіях у галіне машынабудавання, энергетыкі і будаўніцтва, мехатронікі і іншых. На сёння ў БРУ такія заняткі наведваюць больш за 150 вучняў 10—11 класаў з дзесяці школ Магілёва. Апроч тэарэтычных заняткаў, для школьнікаў арганізоўваюцца экскурсіі на прадпрыемствы горада, што дае ім магчымасць убачыць рэальныя вытворчыя працэсы і зразумець спецыфіку работы інжынераў.

Наведванне факультатыўных заняткаў «У свеце тэхнікі і тэхналогій» дапамагае школьнікам вызначыцца з будучай прафесіяй, дае ўнікальны шанц павучыцца ў кваліфікаваных спецыялістаў і атрымаць практычныя парады, а таксама зразумець рэальныя патрабаванні сучаснай інжынернай дзейнасці.

Сёлета ў сценах універсітэта паспяхова асвоілі праграму факультатыўных заняткаў 67 выпускнікоў, якія атрымалі правы паступлення ў ВНУ Рэспублікі Беларусь без уступных іспытаў на шэраг інжынерных спецыяльнасцяў. Выпускнік інжынернага класа паступае ва ўніверсітэт мэтанакіравана, свядома выбраўшы сваю будучую сферу дзейнасці яшчэ са школьнай парты. Такі падыход дае магчымасць падрыхтаваць спецыяліста, які будзе запатрабаваны на рынку працы і зможа зрабіць значны ўнёсак у развіццё эканомікі краіны».


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ИП Пинчук А. И., 213817, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 20, кв. 3, УНП 790908881 |
| **Предмет электронного аукциона –** Станок горизонтально протяжной 7А.534, заводской №141, 1990 г. в., расположенный по адресу: Могилевская область, г. Бобруйск, Орджоникидзе, 78 | **Начальная цена (без НДС) – 40 000,00 бел. руб.** |

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на расчетный счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638

**Срок подписания договора купли-продажи и оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дня после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 10 (десяти) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом торговой площадки «ИПМ-Торги»: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 6 % от цены продажи лота в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.01.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 19.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки** на участие в электронных торгах **принимаются по 18.06.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 29-317-95-42, +375 44 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **Вилейского филиала коммунального унитарного предприятия по обеспечению топливом «Миноблтопливо»**
*(продавец, местонахождение: 222410, Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 199)*
проводит открытый аукцион

**ПО ПРОДАЖЕ ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ, расположенных по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 199:**

**Лот № 1: Автомобиль седельный тягач УРАЛ-43203-1011, 1987 г. в., регистрационный знак АВ 4366-5, рама № 070110; цвет тёмно-зеленый; установлен гидроманипулятор М-75, 2006 г. в., инв. № по бух. учету 90а.
Начальная цена с НДС (20 %) – 9 720,00 бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 972,00 бел. руб.**

**Лот № 2: Полуприцеп специальный сортиментовоз ALKA H-13, 1988 г. в., регистрационный знак 4784 АА-5, рама № 17754, цвет черный, инв. № по бух. учету 102.
Начальная цена с НДС (20 %) – 2 640,00 бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 264,00 бел. руб.**

**Лот № 3: Автомобиль грузовой специальный самосвал ЗИЛ-ММЗ-4502, 1991 г. в., регистрационный знак ОМ 1451, рама № М3176745, цвет тёмно-зеленый, инв. № по бух. учету 57.
Начальная цена с НДС (20 %) – 4 560,00 бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 456,00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by.

Электронные торги состоятся **07.07.2025** в **10.00**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.07.2025** до **17.00**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (029) 754 70 65.**

УНП 601062755

**ЗАО «БелБанкротАукцион»**, организатор торгов по продаже имущества **ООО «АВКОМ СИСТЕМ»** (УНП 192745581), объявляет о проведении **16.06.2025 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrot-torg.by.

Полный перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП: **bankrot-torg.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»** (Продавец) на праве собственности

**Электронные торги проводятся 20.06.2025 в 11.00.**

**Лот № 1:** Межсетевой экран Check Point 6600 Appliance-Base, инв. № 100000104271, 2021 г. в. Адрес: Минская обл., Минский р-н, аг. Михановичи. **Начальная цена с НДС 20 %** – 76 680,00 руб. **Задаток** – 7 668,00 руб.

**Лот № 2:** Межсетевой экран Check Point 6600 Appliance-Base, инв. № 100000104272, 2021 г. в. Адрес: Минская обл., Минский р-н, аг. Михановичи. **Начальная цена с НДС 20 %** – 76 680,00 руб. **Задаток** – 7 668,00 руб.

**Лот № 3:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next CPAPSG3200, инв. № 100000104530, 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., Каменецкий р-н, д. Волчин. **Начальная цена с НДС 20 %** – 22 320,00 руб. **Задаток** – 2 232,00 руб.

**Лот № 4:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next Generation, инв. № 100000104531, 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., Каменецкий р-н, д. Волчин. **Начальная цена с НДС 20 %** – 24 480,00 руб. **Задаток** – 2 448,00 руб.

**Лот № 5:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next CPAP, инв. № 100000104532, 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Дзержинского, 135. **Начальная цена с НДС 20 %** – 22 320,00 руб. **Задаток** – 2 232,00 руб.

**Лот № 6:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next, инв. № 100000104533, 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Дзержинского, 135. **Начальная цена с НДС 20 %** – 24 480,00 руб. **Задаток** – 2 448,00 руб.

**Лот № 7:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104231, 2021 г. в. Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Урицкий с/с, 1. **Начальная цена с НДС 20 %** – 2 040,00 руб. **Задаток** – 204,00 руб.

**Лот № 8:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104232, 2021 г. в. Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Урицкий с/с, 1. **Начальная цена с НДС 20 %** – 2 040,00 руб. **Задаток** – 204,00 руб.

**Лот № 9:** Сервер управления Check Point Smart-1 5050 Next, инв. № 100000104259, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9. **Начальная цена с НДС 20 %** – 108 720,00 руб. **Задаток** – 10 872,00 руб.

**Лот № 10:** Сервер управления Check Point Smart-1 5050 Next, инв. № 100000104260, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9. **Начальная цена с НДС 20 %** – 108 720,00 руб. **Задаток** – 10 872,00 руб.

**Лот № 11:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104261, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9. **Начальная цена с НДС 20 %** – 10 920,00 руб. **Задаток** – 1 092,00 руб.

**Лот № 12:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104262, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9. **Начальная цена с НДС 20 %** – 10 920,00 руб. **Задаток** – 1 092,00 руб.

**Лот № 13:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104235, 2021 г. в. Адрес: Гомельская область, Мозырский район, Козенский сельсовет, 1, А1. **Начальная цена с НДС 20 %** – 2 040,00 руб. **Задаток** – 204,00 руб.

**Лот № 14:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104233, 2021 г. в. Адрес: Гомельская область, Мозырский район, Козенский сельсовет, 1, А1. **Начальная цена с НДС 20 %** – 2 040,00 руб. **Задаток** – 204,00 руб.

**Лот № 15:** Межсетевой экран Check Point 1550 NextGeneration W, инв. № 100000104077, 2021 г. в. Адрес: Минская обл., г. Молодечно, ул. Л. Роменская, 165. **Начальная цена с НДС 20 %** – 2 040,00 руб. **Задаток** – 204,00 руб.

**Лот № 16:** Межсетевой экран Check Point 1550 NextGeneration W, инв. № 100000104076, 2021 г. в. Адрес: Минская обл., г. Молодечно, ул. Л. Роменская, 165. **Начальная цена с НДС 20 %** – 2 040,00 руб. **Задаток** – 204,00 руб.

**Лот № 17:** Межсетевой экран CheckPoint3600Base Appliance with, инв. № 100000104445, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Независимости 117А. **Начальная цена с НДС 20 %** – 10 920,00 руб. **Задаток** – 1 092,00 руб.

**Лот № 18:** Межсетевой экран CheckPoint3600 Base Appliance with, инв. № 100000104446, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Мележа 1. **Начальная цена с НДС 20 %** – 10 920,00 руб. **Задаток** – 1 092,00 руб.

**Лот № 19:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104241, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 4. **Начальная цена с НДС 20 %** – 10 920,00 руб. **Задаток** – 1 092,00 руб.

**Лот № 20:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104239, 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 4. **Начальная цена с НДС 20 %** – 10 920,00 руб. **Задаток** – 1 092,00 руб.

**Лот № 21:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104246, 2021 г. в. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большой Тростенец, ул. Западная, 9. **Начальная цена с НДС 20 %** – 2 040,00 руб. **Задаток** – 204,00 руб.

- при условии единовременной оплаты стоимости объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости помещения;
- при условии оплаты стоимости объекта долевого строительства согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению составляет 40 % от стоимости объекта долевого строительства. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства;
- при кредитовании оплата стоимости объекта долевого строительства производится единовременно в полном объёме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе

# КАБ ЖЫЦЬ БЫЛО ПРЫГОЖА,

## Даведаліся пра развіццё і праблемы сістэмы ЖКГ

Вярбовая алея ў Салігорску і фантан, які свеціцца, у Капылі — гэтыя і іншыя аб'екты ўпрыгожылі райцэнтры Мінскай вобласці за некалькі месяцаў Года добраўпарадкавання. Аб тым, як сталічны рэгіён робяць прыгажэйшым, журналістам расказалі ў горадзе-спадарожніку Смалявічы, дзе, як было адзначана, паспяхова рэалізоўваюцца комплексныя праекты па стварэнні камфортнага гарадскога асяроддзя. Смалявічы — лідар па добраўпарадкаванні ў вобласці.



### КОЖНЫ ГОРАД ПРЫГОЖЫ ПА-СВОЙМУ

У саміх Смалявічах цяпер актыўна добраўпарадкоўваецца тэрыторыя вакол вадасховішча, якая стане працягам парка Народнага адзінства. Нядаўна на месцы пусткі з'явіўся новы сквер для сямейнага адпачынку, у якім ёсць уся належная інфрастуктура, нават фантан.

**Намеснік генеральнага дырэктара ДА «ЖКГ Мінскай вобласці» Кацярына Салаўёва** расказала: «У рамках Года добраўпарадкавання ў рэгіёне адрамантавана 200 гульнявых пляцовак, 23 прыдамавыя тэрыторыі. Работа праводзілася комплексна з уладкаваннем парковак, арганізацыяй пешаходных дарожак, устаноўкай гульнявога абсталявання, азелянення, у правядзенні якога ўдзельнічала і насельніцтва. З пачатку года заменена і адрамантавана звыш 600 малых архітэктурных формаў, што знаходзяцца на землях агульнага карыстання».

Кацярына Салаўёва таксама назвала шэраг знакавых аб'ектаў, на якіх папрацавалі ў тым ліку ў перыяд падрыхтоўкі да 80-годдзя Перамогі: «Гэта алея на праспекце Міру ў Салігорску з 200 вербаў, яе дапаўняюць больш за 5 тысяч петуній; святлодыёдны фантан у Капылі, які стаў адным з самых яркіх упрыгажэнняў горада; малыя архітэктурныя формы ў Валожыне; новы пляж у Дзяржынску; новы аб'ект у Нясвіжы — парк адпачынку паблізу касцёла Божага цела; парк у Фаніпалі; добраўпарадкаванне тэрыторыі каля вадаёма ў Смалявічах». Кожны горад мяняецца і прыўносіць у сваё аблічча новыя арыгінальныя аб'екты добраўпарадкавання.

### ЧЫСТАЯ ВАДА Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

З 2021 года на Міншчыне пабудавана 214 станцый абезжалезвання вады, зазначыў **генеральны дырэктар ДА «ЖКГ Мінскай вобласці» Юрый КУКАШУК:** «Сёлета ў Мінскай вобласці запланавана ўстаноўка 112 станцый абезжалезвання. Мы планава ідзём да завяршэння праграмы «Чыстая вада», мэта якой — забеспячэнне насельніцтва якаснай пітной вадой. З пачатку года ўведзена ў эксплуатацыю пяць станцый. Напрыклад, істотна палепшылася якасць вады ў Жодзіне, дзе здадзены

МЕРКАВАННЕ

# НЯЛІШНІЯ РАБОЧЫЯ РУКІ

## Чаму яны нам спатрэбіліся і ці зможам мы без іх абысціся

У народзе ёсць такі выраз «хто жыў, той бачыў шмат». У рэальным жыцці гэта азначае, што вы можаце, не маючы адукацыйных навыкаў, на ўзроўні жыццёвага досведу разабрацца ў самай складанай праблеме.

На маю думку, дадзенае правіла датычыцца практычна ўсіх сфер нашага жыцця. Бурная дыскусія, якая разгарнулася ў медыяпрасторы з нагоды прыцягнення мігрантаў з іншых краін, яшчэ раз пераканала мяне ў гэтым. Не прэтэндуючы на ісціну ў апошняй інстанцыі, хацеў бы выказаць сваё меркаванне па вышэйзгаданым пытанні без звыклай сёння ўсім палітызацыі, а з пункту гледжання свайго жыццёвага досведу.

### БЕЛАРУСЬ — ГЕАГРАФІЧНЫ ЦЭНТР ЕЎРОПЫ

Наша краіна знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры Еўропы, і ўсе грамадска-гістарычныя працэсы ў нас, з некаторымі агаворкамі, падобныя да тых, што адбываюцца ў любой еўрапейскай краіне. Сярод еўрапейскіх дзяржаў Беларусь знаходзіцца ў тройцы сумных лідараў па стратах насельніцтва ад дзвюх сусветных войнаў мінулага стагоддзя. Адрозненне ж Беларусі ў тым, што ўрбанізацыйныя працэсы, звязаныя з маштабнай індустрыялізацыяй, пачаліся ў нас пасля вайны. Відавочным для ўсіх вынікам такіх працэсаў стала падзенне нараджальнасці і рост працягласці жыцця, на якую паўплываў узровень развіцця медыцыны.

Дэфіцыт рабочай сілы на рынку працы быў заўсёды. Еўрапейскія краіны вырашалі яго за кошт прыцягнення мігрантаў з былых калоній. СССР, які панёс самыя вялікія людскія страты падчас вайны, у пытаннях дэфіцыту рабочых рук выратавала рашэнне, прынятае па асабістым распараджэнні Сталіна ў 1936 годзе, аб заканадаўчай забароне правядзення абортаў. Гэта рашэнне было звязана з катастрафічным падзеннем росту колькасці насельніцтва ў краіне, выкліканым наступствамі Грамадзянскай вайны і некалькімі хвалямі голаду. Пра Галадамор 1930-х гадоў шмат напісана, названыя прычыны і віноўнікі з боку савецкага кіраўніцтва, але ў тых работах няма самага галоўнага: па шматлікіх параметрах Галадамор 1930-х гадоў — наступства палітыкі калектыўнага Захаду таго часу, які ўвёў поўнае эмбарга на тавары з СССР, акрамя збожжа і золата.

Сталінская забарона абортаў праз год, у 1937-м, дала імгненны эфект — нараджальнасць павялічылася на 1 мільён чалавек за год. А рэальная лічба смерцяў жанчын ад нелегальных абортаў склала ад 399 да 900 чалавек за такі ж перыяд. Менавіта гэта пакаленне, народжанае ў эпоху забароны абортаў і пасталелае да сярэдзіны 1950-х гадоў, аднавіла разбураны СССР, калі на чале краіны быў Мікіта Хрушчоў.

### 23 ЛІСТАПАДА 1955 ГОДА — ПАЧАТАК АДЛІКУ ДЭМАГРАФІЧНАГА КРЫЗІСУ

Аўтарам ідэі легалізацыі абортаў і сёння многія лічаць міністра аховы здароўя СССР сярэдзіны 1950-х гадоў Марыю Каўрыгіну. Аборты ў СССР былі легалізаваны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 23 лістапада 1955 года з мудрагелістай фармулёўкай аб адмене крымінальнай адказнасці за аборты, праведзеныя ў медустановах. Насамрэч гэта было асабістае палітычнае рашэнне Мікіты Хрушчова. Для аднаўлення краіны яму хапала працоўных рэсурсаў, якія нарадзіліся пры Сталіне. Без гэтага рашэння Хрушчоў ніколі не вырашыў бы жыллёвую праблему. Адна справа выдаваць «хрушчоўку» на сям'ю з 4-5 чалавек з разліку 9 квадратных метраў на чалавека і зусім іншая — калі сям'я складаецца з 7—10 чалавек, якія пражываюць у горадзе.

Рашэнне лагічна абгрунтоўвалася яшчэ і тым, што дзеці выхоўваліся практычна ў сем'ях. Чэргі ў дзіцячыя садкі былі такімі вялікімі, што ў многіх выпадках, калі падыходзіла чарга ў дашкольную ўстанову, дзеці ўжо вучыліся ў школе. Сістэма сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі без гэтага рашэння не «пераварыла» б такі аб'ём моладзі.

Масавы характар тэндэнцыя з абортамі набыла да сярэдзіны 1960-х гадоў, калі іх у СССР рабілася ад 5 да 6 мільёнаў за год. У 1970-я лічба знізілася да 4,5 мільёна за год. У 1990-м у СССР афіцыйна было зроблена

# КАМФОРТНА І БЯСПЕЧНА

## цэнтральнага рэгіёна



аб'ект коштам 11,5 мільёна рублёў. Гэта глабальны праект, які вырашыў праблему. Два разы на год у Жодзіне мы вымушаны былі выконваць прамыванне сетак. Цяпер вядуцца работы па 50 станцыях ачысткі. І гэта толькі буйныя аб'екты».

Акрамя таго, у сельскай мясцовасці будзе ўстаноўлена 135 міні-станцый ачысткі, з іх 31 ужо ўведзена ў строй. «Для паляпшэння якасці пітной вады ажыццяўляем перападключэнне населеных пунктаў да новых артэзіянскіх свідравін», — дадаў Юрый Кукашук.

### БАРШЧЭЎНІК ЗДАВАЦЦА НЕ ХОЧА

Вялікую ўвагу ў цэнтральным рэгіёне ўдзяляюць барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага. Гэтай інвазійнай раслінай засмечана звыш тысячы гектараў вобласці. Больш за ўсё баршчэўнік распаўсюджаны ў пяці раёнах, расказала **старшыня Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Кацярына ПАЛЯШЧУК:**

«Сярод метадаў барацьбы — ручны, найбольш дастасавальны да індывідуальных гаспадарак і тэрыторый; механічны (абкошванне). Але асноўным і найбольш эфектыўным з'яўляецца хімічны метад. Для правядзення гэтых відаў работ выдаткоўваюцца сродкі, напрыклад, на закупку хімікатаў і аплату паслуг арганізацыям, што праводзяць такія работы. Варта ведаць: адна расліна можа даваць да 20 тысяч насення. І калі мы дапускаем яе цвіценне, то толькі пагаршаем сітуацыю».

Сярод найбольш заражаных баршчэўнікам Сасноўскага раёнаў Мінскай вобласці — Вілейскі, Лагойскі, Чэрвеньскі, Мінскі і Валожынскі. Сумарна засмечаныя інвазійнай раслінай плошчы складаюць больш за тысячу гектараў. «Цяпер заключаны дагаворы па ўсіх раёнах з арганізацыямі, якія могуць праводзіць работы па барацьбе з баршчэўнікам, выдзелены сродкі. Пры гэтым кожны землекарыстальнік павінен таксама агледзець сваю тэрыторыю на наяўнасць інвазійных раслін і прыняць меры, у тым ліку каб пазбегнуць адміністрацыйнага пакарання», — адзначыла Кацярына Паляшчук.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*г. Смалявічы.*




---

4,1 мільёна абортаў, у 1991-м — 3,6 мільёна. Да гэтага варта дадаць, што 10—14 % абортаў у той час давалі ўскладненні, якія вялі да бясплоддзя жанчын. Гэта рашэнне, па сутнасці, прывяло да той дэмаграфічнай праблемы, якую сёння мае Беларусь і Расія. Калі б не было таго рашэння, то ў суме нас усіх сёння, паводле розных ацэнак, было б каля 400 мільёнаў.

З гэтай прычыны некаторым сваім «калегам» я параіў бы працаваць з рэальнымі крыніцамі. Не палітызаваць праблему і не вінаваціць цяперашнюю ўладу. Дэмаграфія — гульня ў доўгую, па сваёй сутнасці чыстая матэматыка.

### ЦІ ЗМОЖА ВЫРАШЫЦЬ СЁННЯ ДЭМАГРАФІЧНУЮ ПРАБЛЕМУ ЗАБАРОНА АБОРТАЎ?

У беларускай публічнай прасторы ідэя заканадаўчай забароны на аборты сёння не абмяркоўваецца. У Расіі дадзеная тэма цяпер набыла характар вострай палітычнай дыскусіі. Многія расійскія палітыкі прапаноўваюць вярнуцца да савецкага досведу і заканадаўча забараніць правядзенне абортаў. Асабіста ў мяне на гэта пытанне няма адказу па дзвюх прычынах. Першая заключаецца ў тым, што сёння медыцынская сістэма прынцыпова змянілася — з'явілася вялікая колькасць прыватных медцэнтраў, якія ў выпадку забароны на аборты стануць аказваць такую паслугу за вялікія грошы. Цяпер існуе мноства фармакалагічных прэпаратаў, каб замяніць падобную хірургічную паслугу. З улікам невялікіх памераў нашай краіны і яе адкрытасці тыя прэпараты будуць нелегальна завозіцца з еўрапейскіх краін. Маё меркаванне па дадзеным пытанні лічу павярхоўным. Хацелася б пачуць думкі наконт гэтага з прафесійнага медыцынскага асяроддзя.

Другая прычына ў тым, што я глыбока ўпэўнены: вырашэнне дэмаграфічнай праблемы знаходзіцца не ў плоскасці адміністрацыйна-палітычнай, а ў грамадскай. Некаторыя «недружалюбныя» да ўлады медыя ў тэлеграм-каналах (без указання імя аўтара матэрыялу) безапеляцыйна напісалі: Прэзідэнт нібыта «абразіў беларускіх жанчын, абвінаваціўшы іх у тым, што яны не хочуць нараджаць дзяцей». Гэта чыстай вады танны хайп. У закліку кіраўніка дзяржавы да шматдзетнасці ў сем'ях стаіць, як заўсёды, жыццёвая мудрасць, глыбокі палітычны вопыт і здаровы сэнс: што калі такая тэндэнцыя захаваецца, то з часам паўстане пытанне аб выжыванні беларускага этнасу. У сусветнай гісторыі з-за розных прычын многія этнасы зніклі. Нам усім трэба пераадолець асабісты эгаізм і зразумець, што мы не першыя і не апошнія на гэтай зямлі, нам трэба не проста нешта, але і некага пакінуць пасля сябе.

### ЦІ ЗМОЖАМ МЫ АБЫСЦІСЯ БЕЗ ПРЫЦЯГНЕННЯ МІГРАНТАЎ?

Найбольш вострай медыйнай тэмай у нашай краіне стала пытанне аб прыцягненні да працы мігрантаў з іншых краін. Узровень непрымання, а калі быць больш дакладным, жаданне некаторых ананімных аўтараў падняць свае рэйтынгі ў тэлеграм-каналах ашалелай крытыкай улады, проста зашкальвалі. Пытанне аб магчымым прыездзе на работу ў нашу краіну пакістанцаў стала для гэтага добрай падставай. Тыя з нас, хто сябруе з галавой, на практыцы ўбачылі, што сацыяльныя сеткі нясуць у сабе адначасова як стваральную, так і разбуральную сілу.

Калі разумна разважаць, то ўзнікае пытанне: «Ці зможам мы сёння пераадолець дэфіцыт на рынку працы спецыялістаў рабочых прафесій?» Адназначна, не. Мы жывём тут і цяпер. Крытыкі ўлады, на маю думку, не маюць уяўлення аб тым, што сістэма прыцягнення мігрантаў, яе дакладнасць і прапісанасць усіх працэдур да дробязяў у грамадскай супольнасці Расіі бярэцца ў якасці прыкладу, які варта было б у нас пераняць. У беларускай сістэме прыцягнення прадстаўнікоў іншых краін на работу на нашых прадпрыемствах улічаны ўсе памылкі, якія маюць месца ў міграцыйнай палітыцы краін Заходняй Еўропы.

Тым, хто сёння крытыкуе падыходы ўлады ў міграцыйнай палітыцы, я параіў бы ўнесці свае прапановы па гэтым пытанні. Хоць разумею, што мая парада бескарысная з той прычыны, што альтэрнатыўных варыянтаў вырашэння дадзенай праблемы ні ў кога сёння няма. Каб зразумець усю сутнасць, некаторым «калегам» я прапанаваў бы пайсці на курсы кіроўцаў аўтобуса ці тралейбуса, скончыць іх і папрацаваць у сістэме гарадскога транспарту. Для таго каб выйсці ў рэйс у 1-ю змену, прачынацца ім трэба будзе ў 3 гадзіны ночы. Можна зрабіць і прасцей — схадзіць на экскурсію на які-небудзь буйны завод і проста пастаяць у кавальскім, прэсавым або ліцейным цэхах. Сур'ёзныя эмоцыі ад такога наведвання радыкальна прачысцяць мазгі — гарантую.

Прызнаюся, да лістапада мінулага года я таксама быў скептыкам у пытанні мігрантаў. Так склалася, што на працягу месяца ў мяне былі дзве аднадзённыя камандзіроўкі на Гомельшчыну. Пасля вяртання ў Мінск стомленасць была неймаверная. Калі ў трамваі ў першы раз юнак азіяцкай знешнасці кранууў мяне за плячо і саступіў месца, я быў моцна здзіўлены. Праз тыдзень, пасля другой камандзіроўкі іншы малады мігрант зрабіў тое ж самае... У гэтых маладых хлопцах, якія прыехалі ў Беларусь на заробкі, нешта ёсць.

**Мікалай КАЛІНІН.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а. УНП 100233809 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**
**Адрес: г. Минск, ул. Олешева, д. 9-2, 9-4**

| № лот | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Административное помещение 248,9 кв. м** (500/D-708107678) | **440 700,00** |
| 2 | **Административное помещение 178,9 кв. м** (500/D-708107680) | **335 400,00** |

**Начальная цена снижена на 35 %**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, бязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов по лотам 1,5 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.11.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит повторные торги в форме открытого аукциона

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЙ,**

расположенных по адресу:
**Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15,**
принадлежащие ОАО «Мозырский спиртоводочный завод»
(Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор»
(УНП 491343813) –
производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016).

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомится на **www.bankrot.gov.by** либо на сайте организатора аукциона **www.cpo.by,** по тел.:
+375 29 805 93 30 (Светлана Павловна);
+375 29 8717025 (Валерий Петрович).

**Аукцион состоятся 13.06.2025 в 13.00**
по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512.
Заявки принимаются **с 09.00 30.05.2025 по 12.06.2025 до 17.00** по указанному адресу



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона, г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **РУП «Любанское ЖКХ»**
(продавец, г. Любань, ул. Ленина, 2, тел. 801794-68-7-06)
проводит повторный открытый аукцион

по продаже **изолированного помещения**
**с инв. № 643/D-5515 общей площадью 50,2 кв. м**
**(составные части и принадлежности – сарай), расположенного по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Дзержинского, 9-2.**

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 623450100001002267, пл. – 0,1306 га.**
Начальная цена без НДС – **6 980,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **698,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 80 %.**
Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 03.04.2025, 14.05.2025.

Аукцион состоится **18.06.2025** в **12.00**
по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.06.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (801794) 68-7-06.**
Информация о торгах опубликована на сайтах:
**minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by.**

УНП 600208822

ДОБРАЯ НАВІНА

# ДЛЯ ЮНАРМЕЙЦАЎ І КРАЯЗНАЎЦАЎ

## Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі ўрачыста адкрылі ў Брэсце

Праектам, які закліканы аб'яднаць пакаленні, зрабіць унёсак у фарміраванне будучыні Беларусі, называюць патрыятычны цэнтр для моладзі, першую чаргу якога ў сціслыя тэрміны ўзвялі на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Цэнтр створаны, каб аб'яднаць педагогаў і кадэцкі рух, пошукавыя атрады і рэканструктараў, установы адукацыі і краязнаўства, а таксама ўсіх тых, хто зберагае памяць.

Усебеларускай маладзёжнай будоўляй цэнтр быў аб'яўлены ўказам Прэзідэнта 9 жніўня 2023 года. І ўжо ў лістападзе на будоўлі закіпела работа. А ў лютым 2025-га было аб'яўлена аб завяршэнні першай чаргі аб'екта. На Кобрынскім умацаванні крэпасці з'явіўся інтэрнат з вучэбнымі класамі, абсталяваны на базе былой казармы 125-га стралковага палка, і спальным корпусам. Побач уладкаваны стадыён, скаладром, ваенна-спартыўныя палосы, разгорнуты палатачны гарадок, які будзе функцыянаваць у цёплую пару года.

А ў планах — будаўніцтва другой чаргі. Яно прадугледжвае яшчэ адзін вучэбны корпус. Будзе адноўлены будынак XIX стагоддзя, дзе ў 20 класах змогуць займацца хлопчыкі і дзяўчынкі. У другую чаргу ўваходзіць і рэканструкцыя сталовай на 300 пасадачных месцаў, і добраўпарадкаванне тэрыторыі. А падчас трэцяга этапу адбудзецца рэканструкцыя Заходняга форта на Кобрынскім умацаванні для размяшчэння там вучэбна-забаўляльнага цэнтра на 500 вучняў. Пасля завяршэння ўсіх работ цэнтр зможа прымаць да 7 тысяч школьнікаў у год.

На цырымонію адкрыцця сабраліся ўдзельнікі першай змены летняга лагера і шматлікія госці. **Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК** адзначыў, што ў справе будаўніцтва важнага аб'екта ўдзельнічала каля 2700 маладых людзей — валанцёраў, актывістаў і членаў БРСМ. «Сёння тут створаны цудоўныя ўмовы для заняткаў спортам, і, вядома, гэта месца для знаёмства навучэнцаў з розных куткоў краіны. Цэнтр паслужыць справе выхавання патрыятызму, грамадзянскай адказнасці, павагі да гістарычнай спадчыны. У хуткім часе ён стане міжнародным, да нашых школьнікаў прыедуць равеснікі з рэгіёнаў Расіі. Адкрыццё цэнтра стала падарункам для маладога пакалення да 80-годдзя Перамогі», — падкрэсліў губернатар.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# АЗДАРАЎЛЕННЕ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ — САМАЕ ДАСТУПНАЕ

## ДАПЛАТА БАЦЬКОЎ — АД 10 %



Фота БелТА.

У школьнікаў з 1 чэрвеня пачаліся самыя доўгія канікулы. З першымі днямі лета адчынілі свае дзверы і аздараўленчыя лагеры. Попыт на дзіцячы летні адпачынак і аздараўленне ў іх значны і штогод толькі павялічваецца, як адзначае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Аляксандр ЦАЙ**.

— Летась у лагерах аздараўленне прайшлі 399,6 тысячы дзяцей — рэкордная лічба. Сёлета попыт не меншы. Чакаем, што прыкладна 400 тысяч дзяцей будзе аздароўлена, — расказаў ён.

На правядзенне дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі ў гэтым годзе выдзелена больш як 73 мільёны рублёў. З іх 72 мільёны — на патанненне пуцёвак са сродкаў рэспубліканскага бюджэту, каля 800 тысяч — для набыцця бясплатных пуцёвак для льготнай катэгорыі дзяцей, 600 тысяч пайшло на падрыхтоўку лагераў да работы летам.

У сярэднім пуцёўка ў круглясутачныя стацыянарныя загарадныя лагеры каштуе каля 675 рублёў. Памер патанення быў зацверджаны ў сакавіку па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў — 285 рублёў, а гэта 42 % ад яе кошту.

— З улікам таго, што яшчэ даплачваюць бацькам і патанняюць дадаткова мясцовыя бюджэты, прафсаюзныя арганізацыі і самі наймальнікі, згодна з калектыўнымі дагаворамі, асноўнае патрабаванне, якое прад'яўляецца сёння нарматыўна-прававымі актамі, — бацькі павінны заплаціць не менш за 10 % ад кошту — каля 70 рублёў. Усё астатняе ім можа быць кампенсавана з розных крыніц, — растлумачыў Аляксандр Цай. — Гэта вельмі істотная дапамога. У прыярытэце — няпоўныя, малазабяспечаныя, шматдзетныя сем'і, дзеці-інваліды, дзеці-сіроты. Ім фактычна аплацяць поўны кошт, а законным прадстаўнікам застанецца даплаціць толькі невялікую частку.

Сярэдні кошт пуцёўкі ў дзённы лагер — каля 144 рублёў, з улікам патанення — 120 рублёў (84 %).

— Дзесьці кошт ніжэйшы, дзесьці — вышэйшы. Сёння летні адпачынак і аздараўленне цалкам даступныя для дзяцей нашай краіны. Такім чынам, ствараюцца ўсе неабходныя ўмовы, — падкрэсліў Аляксандр Цай.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Лот № 1** | |
| **Наименование объекта продажи** | Капитальное строение с инвентарным номером № 451/С-1893 (здание банка) общей площадью 2595,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Дятлово, ул. Комсомольская, д. 2 |
| **Начальная цена продажи** | 789267,68 (семьсот восемьдесят девять тысяч двести шестьдесят семь белорусских рублей 68 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 131544,61 (сто тридцать одна тысяча пятьсот сорок четыре белорусских рублей 61 копейка) |
| **Сумма задатка** | 78900,00 (семьдесят восемь тысяч девятьсот белорусских рублей 00 копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **09.07.2025 в 10.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | **В рабочие дни с 09.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 16.00 часов 07.07.2025 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Дополнительные условия** | Объект недвижимости имеет следующие обременения:<br>- часть изолированных помещений передана в аренду (площадь 42,9 кв. м) и в безвозмездное пользование (площадь 393,9 кв. м);<br>- реализация проводится с условием размещения на площадях объекта недвижимости центра банковских услуг для обслуживания населения (с заключением договора аренды);<br>- продаже подлежит следующее прочее имущество: циркуляционный насос НЦ63/7.1 (33,41 бел. руб.); устройство АВР (автом. включатель ре) (30,96 бел. руб.); теплосчетчик ТЭМ-4 (199,44 бел. руб.); кондиционер настенный Panasonic (150,00 бел. руб.); электросчетчик (6,53 бел. руб.); узел учета и регулирования тепла (241,80 бел. руб.); кондиционер MDV MDSF-12HRN1 (30,13 бел. руб.); система кондиционирования воздуха н.б и внбТАСО24 – (130,43 бел. руб.); монометр (4,66 бел. руб.); монометр (4,66 бел. руб.); термометр (3,0 бел. руб.); термометр (3,0 бел. руб.); термометр (3,0 бел. руб.); соединительная коробка (5,04 бел. руб.); счетчик электрической энергии (92,66 бел. руб.); счетчик электрической энергии CE 103 BY R33 043 (84,24 бел. руб.); пожарная сигнализация (1022,29 бел. руб.); ЛВС-кабельная система на 80 портов (1125,00 бел. руб.); кабельная линия связи до РУЭС (20 пар) (980,40 бел. руб.). Общая стоимость прочего имущества – 4150,65 (четыре тысячи сто пятьдесят белорусских рублей 65 копеек) с учетом НДС по ставке 20 %. Приобретаются победителем аукциона либо единственным участником аукциона на основании отдельно заключенного договора купли-продажи |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (1563) 34597, +375 (44) 5455954 (А1) |
| **Лот № 2** | |
| **Наименование объекта продажи** | Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-14861, (здание гаража), общей площадью 30,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Ивьевский район, г. Ивье, ул. Карла Маркса, 11А |
| **Начальная цена продажи** | 4920,00 (четыре тысячи девятьсот двадцать белорусских рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 820,00 (восемьсот двадцать белорусских рублей 20 копеек) |
| **Сумма задатка** | 490,00 (четыреста девяносто белорусских рублей 00 копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **09.07.2025 в 10.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | **В рабочие дни с 09.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 16.00 часов 07.07.2025 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (01595) 64007, +375 (44) 5455954 (А1), +375 (44) 7989168 (А1) |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка до 07.07.2025 на счет № BY69AKBB66708597000020000000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Аукцион проводится при наличии не менее двух допущенных к участию в нём участников. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победителю аукциона задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчётах по приобретению предмета аукциона.

Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, аукцион признается несостоявшимся. В данном случае предмет аукциона продается участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

УНП 100325912

НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ

# ЗАГІНУЦЬ, КАБ... ЖЫЦЬ У НАШЧАДКАХ

**Год 1941-ы ў сям'ю Свістуновых прынёс шмат гора. Перад самай вайной здарыўся пажар, у ім загінула чатырохгадовая дачушка Надзя. Аднагадовую Ніну бацька паспеў тады вынесці з агню.**



— Жылі мы ў вёсцы Слабадзішча. У першую ж мабілізацыю тата пайшоў на фронт і назад не вярнуўся, — расказвае Ніна Кузьмінічна. — Я ведаю яго па адзіным фотаздымку, дзе яны з мамай удваіх і зусім маладыя. Вайна адабрала ў іх шчасце. Тата загінуў, і мамка нагаравалася за семярых. У акупацыю прытуліла яўрэйку з дзіцем. Нехта данёс... Матулю схапілі і пагналі ў канцлагер пад Рудню. Я, маленькая, на некалькі месяцаў засталася ў чужых... На шчасце, мама потым вярнулася.

...Пасля вызвалення, калі ў вёсцы стаялі савецкія вайскоўцы, яна, Пелагея Мяфодзьеўна, гатавала ім ежу ў старой кузні. Там яны з Нінай і жылі, бо вёску Слабадзішча пры адступленні дашчэнту спалілі немцы. Удаве з дзіцем трэба было будавацца. Родных, каб хоць трохі дапамагчы, у іх не засталося — падтрымалі хіба суседзі Окуневы, з якімі сябраваў бацька.

— З мамай, помню, пілавалі бярвенні, — працягвае Ніна Кузьмінічна. — І я, дзесяцігадовая, як магла, цягала пілу-двухручку. У сорак дзявятым мы нарэшце перабраліся з кузні ў сваё жытло. Мама працавала ў калгасе, я хадзіла ў школу, але скончыла толькі пяць класаў, бо мы займелі карову, яе трэба было даглядаць... Навучылася даіць і ў 15 гадоў пайшла ў даяркі на ферму, дзе працавала да самай пенсіі.

Была замужам. З Аляксандрам Яфімавічам Маслаковым вырасцілі двюх дачок і сына, а вось унукаў ды праўнукаў гадавала ўжо ўдавой.

Рада цяпер, што іх цягне да бабулі ў вёску Пырхі, што прыязджаюць яны і з Віцебска, і з Лёзна, каб дапамагчы і адпачыць.

Сядзіба ў Ніны Кузьмінічны добра дагледжана, гаспадыня сама да нядаўняга часу кожнага з гасцей сустракала і частавала, кожнага праводзіла. Але сёння ёй самой ужо патрэбна падтрымка, і таму хто-небудзь з родных заўсёды побач.

...Дачка, Раіса Аляксандраўна Мінаева, паказала ўзнагароды працавітай матулі-калгасніцы і адзіны фотаздымак бацькі, які вынес дзіця з палаючай хаты, які ў полымі вайны загінуў сам, але працягвае жыць у дзецях дзяцей. Іх пакуль што 16.

**Таццяна Ігнаценка,**
*Лёзненскі раён.*

НА ЧУЖЫХ ПАМЫЛКАХ

# НЕ СТОЙЦЕ Ў ДЗЯЦЕЙ НА ШЛЯХУ

**Апошнія паўтара-два месяцы майго жыцця — гэта бальніца, аперацыя, лекі, працэдуры і... ціхія, шчырыя размовы, падчас якіх амаль кожны са сталых сяброў па няшчасці шкадаваў аб зробленых памылках, хацеў бы неяк выправіць іх, але ўсё што мог — гэта расказаць... Мне заставалася толькі запісваць, каб, магчыма, хоць кагосьці ды папярэдзіць.**

...Валянціну было 19, калі аднойчы яго пабудзілі вайскоўцы, загадалі збірацца і завезлі на танкавы палігон.

Там, на месцы, ваеннаслужачыя запасу, так званыя партызаны, пераадзеліся ў адпаведнае абмундзіраванне, пастроіліся і рушылі да танкаў.

Валянціна — маладога фельчара, загадчыка вясковага ФАПа, камандзір паклікаў да сябе ў кабінет, пацікавіўся работай і зарплатай, а калі малады чалавек агучыў яе, шчыра засмяяўся: я, маўляў, так і думаў... А далей — «Магу дапамагчы. У нашай медсанчасці ёсць вакансія». — «Не мая, — запярэчыў Валік. — Я — малады спецыяліст. Наперадзе амаль тры гады адпрацоўкі». — «Гэта не праблема. Перавод можна аформіць праз ваенкамат», — патлумачыў афіцэр і паабяцаў, што хлопец, апроч добрага акладу, адразу атрымае кватэру, накіраванне на курсы ваенных медыкаў...

Такія перспектывы і ўзрадавалі, і азадачылі Валянціна, бо ён быў вельмі прывязаны да сваіх бацькоў, да сям'і, дрэнна ўяўляў, што зможа некуды з'ехаць... Але заяву на перавод усё-ткі напісаў.

Пасля збораў у добрым гуморы вярнуўся дамоў, адразу ж ледзь не з парога расказаў бацькам аб магчымых змяненнях і тут жа пачуў матуліна: «Не пушчу!.. Будзеш працаваць там, дзе працаваў! Будзеш нам дапамагаць — больш няма каму».

Валік падумаў і згадзіўся, прычым пераканалі яго не столькі рашучыя словы, колькі матуліны слёзы. Ёй ды бацьку і сапраўды нялёгка жылося: яны трымалі вялікую гаспадарку, 40 сотак агарода засявалі бульбай ды іншымі культурамі, працавалі ў калгасе. А гэта, апроч іншага, яшчэ і гектары так званых дзялянак з лёнам, цукровымі і кармавымі буракамі, якія ўручную трэба было апалоць, прарваць, яшчэ раз апалоць...

Днямі Валянцін прападаў на асноўнай рабоце, а пасля яе заступаў на дадатковую — на калгасных палетках, поплеч з бацькамі. У іх, праўда, быў яшчэ адзін сын, Жоржык, але ў таго вечна нешта балела — то жывот, то галава, то спіна, то шмат урокаў задалі... Рос гэткім мамчыным сынком, «кацяняткам», якому дазвалялася доўга спаць, смачна есці і гуляць, а Валянцін чаго толькі не рабіў: капаў торф на балоце, касіў і вазіў сена, абрабляў калгасныя палеткі, ірваў лён, карміў хатнюю жывёлу, палоў грады...

Прыйшла пара, і ён сустрэў сваё каханне: у бацькоўскую хату (іншага жытла не было) прывёў маладую жонку. Яна аказалася такой жа ціхмянай і такой жа працавітай, як сам, і цяпер ужо ўдваіх, нават чакаючы і гадуючы малых, Валік з Ганнай працягвалі працаваць на бацькоў. Яны ніколі не мелі выхадных, ні разу не з'ездзілі ў водпуск, не бачылі мора. І пры гэтым ні самі, ні іх падрослыя ў працы дзеці не тое што не ўбачылі грошай за працу, нейкай падзякі, нават не пачулі яе!.. Хутчэй наадварот: перад смерцю маці прагаварылася, што кожную «лішнюю» капейку (заробленую ў тым ліку Валянцінам і яго сям'ёй) усё жыццё аддавала... Жоржыку. Яму ж, «кацянятку», малодшаму сыну, застаўся бацькоўскі дом з усім нажытым багаццем.

Старэйшы судзіцца не стаў: страціўшы здароўе, ён усё часцей успамінаў мінулыя гады і думаў, што пражыў іх не так, як хацелася б самому, а так, як казалі бацькі. Ён не змог пакінуць іх, ён адмовіўся ад перспектыў, што адкрываліся перад ім у 19, ён служыў людзям, якія карысталіся гэтым у сваіх вельмі вузкіх інтарэсах.

Адно толькі цешыла гэтага без пары ссівелага чалавека: у яго выраслі цудоўныя дзеці, а потым і ўнукі! Усе яны, атрымаўшы вышэйшую адукацыю, ехалі працаваць і жыць там, дзе хацелі; усе яны самі, па сваім разуменні, будавалі сем'і і сваё жыццё. Ні бацькі, ні бабуля з дзядулем, не заступалі ім дарогу, не прасілі застацца дома. І (як мне здаецца) правільна рабілі!

**Святлана Дым,**
*Салігорскі раён.*

## МОЗЫРСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

### 10 июля 2025 г. проведет аукционные торги по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность на территории Мозырского района Гомельской области

| Местоположение не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка | Сведения о предмете аукциона | | Сведения об участке (ограничения в использовании, наличие коммуникаций) | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, вносимого участником, бел. руб. | Затраты на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом | Земельный участок | | | | |
| **Гомельская область, Мозырский район, Козенский с/с, д. Наровчизна, ул. Южная, 2** | Наружная площадь – 113 м², готовность – 8 %, составные части и принадлежности – отсутствуют | Площадь 0,1037 га, кадастровый номер 323581203601000482, вид права – частная собственность, целевое назначение – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | Имеется возможность подключения к следующим инженерным коммуникациям: сетям электроснабжения, водоснабжения, канализации, газоснабжения, связи. Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне электрической сети | 17831,58, в том числе: 6403,84 – не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома; 11427,74 – земельного участка | 1783,16 | 3514,92 (без учета расходов по размещению извещений в СМИ) |

Организатор аукционных торгов – Мозырский районный исполнительный комитет.

Извещения опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by, главного управления землеустройства Гомельского областного исполнительного комитета http://gomeloblzem.by, Мозырского районного исполнительного комитета http://mozyrisp.gov.by/ru, газете «Жыццё Палесся».

Аукцион состоится **10 июля 2025 г. в 10.00** в Мозырском районном исполнительном комитете по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, пл. Ленина В. И., 16, малый зал заседаний, 1-й этаж, при наличии не менее двух участников на лот. Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), также в аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующие заявления об участии в аукционе, а также заключившие с Мозырским районным исполнительным комитетом соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы для участия в торгах принимаются с даты опубликования объявления о проведении аукциона по рабочим дням с 09.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до14.00) по **4 июля 2025 г.** включительно в управлении землеустройства Мозырского районного исполнительного комитета (г. Мозырь, пл. Ленина В. И., 16, кабинет 310, контактный телефон 80236300194).

Кроме того, в комиссию представляются:

документ (с отметкой банка), подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет Мозырского районного исполнительного комитета BY20AKBB36414230001013300000, ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 400036117, код назначения платежа OTHR 90101;

информацию о реквизитах банка и номере текущего (расчетного) счета открытого для возврата внесенных задатков;

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией по предмету аукциона и его месторасположением в срок по 4 июля 2025 г. включительно. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии проектно-изыскательских работ.

Заключительная регистрация участников аукциона осуществляется **с 09.00 до 09.30 10 июля 2025 г.** по адресу: (г. Мозырь, пл. Ленина В. И., 16, кабинет 310, 3-й этаж). Граждане, негосударственные юридические лица, которые не прошли заключительную регистрацию к участию в аукционе не допускаются.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления Мозырским районным исполнительным комитетом рассрочки ее внесения);

возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией возникновения права на земельный участок;

разработать и утвердить в установленном законодательстве порядке в срок, не превышающий один год со дня возникновения права на земельный участок, проектно-сметную документацию для завершения строительства приобретенного незавершенного незаконсервированного капитального строения. Завершение строительства одноквартирного жилого дома осуществить на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

юридическому лицу в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года со дня утверждения проектно-сметной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно строительному проекту;

соблюдать права и обязанности землепользователя, предусмотренные статьями 84 и 85 Кодекса Республики Беларусь о земле

# КАЛІ «ПЕРАМОГА» — ТО НА ЎВЕСЬ СВЕТ

**Рэспубліканскі тэатральны фестываль назваў найлепшыя пастаноўкі на ваенную тэму**

Сярод 15 спектакляў, якія ўваходзілі ў праграму, былі пастаноўкі гасцей — Нацыянальнага драматычнага тэатра Расіі (Александрынскага тэатра) з Санкт-Пецярбурга. Акрамя таго, сваю пастаноўку «А зоры тут ціхія» на кітайскай мове паказалі навучэнцы тэатра-студыі Еўсцігнея Міровіча Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Дзякуючы ўдзельнікам з сяброўскіх краін фестываль становіцца міжнародным і дазваляе казаць пра подзвіг нашага народа на ўвесь свет. Прынамсі, пра гэта сказаў Руслан Чарнецкі, які з'яўляецца міністрам культуры Беларусі, але тэатралы яго ведаюць як дзеючага артыста. На фестывалі ў яго была асаблівая роля — адзначыць лаўрэатаў.

Найлепшых выбіралі з 11 беларускіх спектакляў. Самая лепшая ў катэгорыі драматычнага тэатра — пастаноўка «Трыбунал», якую ў канцы мінулага сезона ажыццявіў Аляксандр Казак у Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы. Пераважна на сцэне былі творы пра вайну, як яе адчувалі беларускія аўтары. Напрыклад, Аляксей Дудараў у драме «Радавыя» — яе ўвасобіў Тэатр-студыя кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», Аляксандр Яфрэмаў атрымаў прыз за найлепшую рэжысуру. «А зоры тут ціхія» Купалаўская паводле расійскага пісьменніка Барыса Васільева цяпер адзначаны за «Найлепшую сцэнаграфію» — мастак-пастаноўшчык Аляксандр Камянец. Выканаўцаў найлепшай мужчынскай і жаночай роляў знайшлі ў пастаноўках паводле беларускіх аўтараў. Дзяніс Фешчанка атрымаў узнагароду за ролю ў спектаклі Мінскага абласнога драматычнага тэатра «Сем трафеяў радавога Шапкіна» паводле Васіля Ткачова, а Вераніка Буслаева — за работу ў спектаклі «Хатынь» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі паводле аповесці Алены Кобец-Філімонавай. Маладзёжны тэатр эстрады да 80-годдзя Перамогі падрыхтаваў гістарычную меладраму Уладзіславы Арцюкоўскай «Без тэрміну даўнасці» — і атрымаў спецыяльны прыз журы «За найлепшае аўтарскае прачытанне тэмы Вялікай Айчыннай вайны». Сіла беларускага духу адлюстравана ў паэме «Сымон-музыка» Якуба Коласа. Яе ўвасобіў адзін з найбольш яркіх рэжысёраў Беларусі Алег Жугжда ў Гродзенскім абласным тэатры лялек, што ў дадзенай катэгорыі атрымала адзнаку «Найлепшы спектакль». Таму што «Перамога» — гэта не толькі пра вайну, але і больш глабальна: пра супрацьстаянне дабра і зла.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

СВЕТ КНІГ

# КАМПАНІЯ ДЛЯ ДОБРАГА АДПАЧЫНКУ

У сучасным свеце за нашу ўвагу змагаюцца многія, але ж, калі ёсць магчымасць паставіць на паўзу вірлівае жыццё і ўзяць у рукі кнігу... Да ўвагі — падборка кніжных навінак Выдавецкага дома «Звязда».

## СІЛА ЖЫНЧЫНЫ ШМАТГРАННАЯ




Раман Валянціны Быстрымовіч «І ўсё ж такі я яго пацалую» — не проста гісторыя пра каханне паміж мужчынам і жанчынай, але і пра любоў да розных людзей, да самога жыцця. У кнізе чытач можа знайсці ўсё: і лёгкую мову, і лірычнасць, і адметных персанажаў. Як, напрыклад, галоўная гераіня Ніна. Гэта разумная, валявая, прынцыповая, бясстрашная жанчына ўмее адстаяць свае і дабіцца пастаўленых мэт. Яе стасункі з іншымі людзьмі даюць аснову для цікавага сюжэта, у якім ёсць і нечаканыя павароты развіцця падзей, і непрадказальны фінал. Гэта раман пра каханне і ўсё, што яго суправаджае: смех і слёзы, надзеі і расчараванні, памылкі і выпрабаванні, вернасць і здрада... А яшчэ пра наш час, пра ўладу грошай, пра страчаных сяброў і набыты досвед. Кніга таксама мае падказкі для тых, хто апынуўся на мяжы. Бо адчай часам можа падштурхнуць нас да непапраўнага, а вось пачуццё абавязку і сумленне — уратаваць жыццё.

## МАРЫ ПАВІННЫ ЗДЗЯЙСНЯЦЦА




Менавіта такую назву мае кніга лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Сяргея Давідовіча. У выданні сабраны казкі, кожная з якіх вучыць спагадлівасці, шчырасці і заклікае ставіцца да ўсяго жывога на Зямлі беражліва і адказна. Напрыклад, у казцы «Нечаканая старасць» хлопчык Славік аднойчы сустракае незнаёмца, размова з якім на пэўны час кардынальна мяняе яго рэальнасць, а пасля і далейшае жыццё: *«Славік, адчыніўшы дзверы роднай хаты, з парога закрычаў: — Мама! Тата! Я вярнуўся! Калі трэба мая дапамога, я ўсё зраблю!»*

Не менш цікава будзе чытачам пазнаёміцца з героямі казак «Мары павінны здзяйсняцца» і «Залатан», бо кожны з іх — прыклад адважных людзей і птушак, пра прыгоды, адкрыцці і загартоўку на кожнай новай дарозе. *«Няўдалыя, галодныя дні здараліся ўсё часцей і часцей... І арол прымае рашэнне, якое пры іншых абставінах не прыняў бы ніколі: — Да людзей! Да людзей! — рашуча паўтараў ён, як ратавальную малітву...»* А ўжо што здарылася пасля той сустрэчы і як развіваліся падзеі, лепш даведацца падчас чытання казкі «Залатан».

## БАГАЦЦЕ — МЕЦЬ СЯБРОЎ




Папоўнілася навінкай таксама серыя «Школьная бібліятэка класікі». У новай кнізе — апавяданне Генрыха Далідовіча «Страта» і казка Георгія Марчука «Чужое багацце». Абодва творы ўваходзяць у праграму па беларускай літаратуры для 5 класа, але звяртацца да мастацкага слова варта ў любым узросце. У дадзеным выпадку і «Страта», і «Чужое багацце» — гэта не проста магчымасць атрымаць задавальненне ад сюжэта і прыгажосці беларускай мовы, але і знаёмства з яркімі героямі. Кожны з іх дае нагоду глядзець на звыклае па-новаму, натхняе быць рашучымі, шчырымі і жыццярадаснымі ў любых жыццёвых сітуацыях. *«Я не ўмею гуляць у футбол, — нечакана прызнаўся Міця і, здаецца, нават крыху збянтэжыўся. Можа і за тое, што яго могуць палічыць за нейкага хліпака, а не за мужчыну. — А па-другое, мне няможна бегаць, цяжка падымаць. У мяне лейкоз...»* — вось, бадай, тое месца ў апавяданні «Страта», пасля якога можна назіраць за яго героямі ў нязвыклых для іх абставінах. Як яны пасталеюць, як знойдуць новыя сэнсы ў сяброўстве, каб потым беражліва несці іх па жыцці.

**Алена ДРАПКО.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ
### на право размещения средств рекламы на государственном недвижимом имуществе в г. Гомеле

Торги проводятся **02.07.2025 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, пр. Ленина, 3, комн. 501.
Организатор торгов – Коммунальное производственное унитарное предприятие «Гомельский городской информационный центр», г. Гомель, ул. Красноармейская, 34а, пом. 1, УНП 400564635, тел. 8 (0232) 341667, **www.gomel.gov.by**. Форма торгов – открытый аукцион.

| № предмета торгов | Место размещения средства наружной рекламы | Вид средства наружной рекламы | Размер рекламного поля, мм | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество рекламных полей, ед. | Общая площадь рекламных полей, кв. м | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. | Обязательные условия |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Шилова, 4 | Кронштейн двухсторонний | 1200Х900 | 1,08 | 2 | 2,16 | 90,72 | 90,72 | Внутренняя подсветка, вертикальная ориентация |
| 2 | ул. Волотовская, 2 | Кронштейн двухсторонний | 1000Х700 | 0,7 | 2 | 1,4 | 58,80 | 58,80 | Внутренняя подсветка, вертикальная ориентация |
| 3 | ул. Ирининская, 2 | Кронштейн двухсторонний | 1000Х700 | 0,7 | 2 | 1,4 | 58,80 | 58,80 | Внутренняя подсветка, вертикальная ориентация |

Технические требования и условия размещения средств наружной рекламы:

- средства наружной рекламы должны соответствовать требованиям СТБ 1581-2008 «Средства наружной рекламы. Общие технические требования и определения»;

- средства наружной рекламы должны размещаться в соответствии с требованиями к размещению средств наружной рекламы в пределах придорожной полосы (контролируемой зоны) автомобильной дороги, красных линий улиц, дорог или площадей населенных пунктов, установленными в приложении 1 к постановлению Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 г. № 395.

Документы на участие в торгах принимаются по **27.06.2025** включительно с 09.00 до 13.00 и с 13.30 до 15.00; в рабочие дни с понедельника по пятницу по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34а, пом. 1, тел. 34-16-67. Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются.

Торги проводятся в форме открытого аукциона на повышение начальной цены в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 7 июля 2021 г. № 395.

Задаток в размере начальной цены каждого предмета торгов должен быть внесен не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов Государственного предприятия «ГГИЦ» № BY62AKBB30120453053673000000 Гомельское областное управление № 300 ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, БИК AKBBBY2X, УНП 400564635, получатель – Государственное предприятие «ГГИЦ» (назначение платежа – задаток для участия в аукционе на право размещения средства наружной рекламы по лоту № (указать номер лота).

Лицо, желающее принять участие в торгах, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах, обязано заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов и предоставить организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах установленной формы;

- эскиз средства наружной рекламы в увязке с конкретной архитектурно-планировочной ситуацией по месту его размещения, выполненный на бумажном носителе в цвете;

- копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на расчетный счет организатора торгов;

- заверенная копия документа, подтверждающая полномочия руководителя юридического лица.

При подаче документов для участия в торгах и заключении соглашения:

- физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, предъявляет организатору документ, удостоверяющий личность;

- представитель физического лица, в том числе индивидуального предпринимателя, юридического лица, предъявляет организатору оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Оплата цены продажи предмета торгов осуществляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов за вычетом внесенной им суммы задатка.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Задаток возвращается всем участникам торгов, кроме победителя торгов (лица, приравненного к победителю торгов), в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается.

До проведения торгов с участниками заключается соглашение, в котором предусмотрены права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения торгов, в том числе и размер штрафа, уплачиваемого участником, выигравшим торги, но отказавшимся или уклонившимся от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам торгов, и (или) возмещения затрат на организацию и проведение торгов, и (или) перечисления суммы средств, за которую продан предмет торгов; участниками, отказавшимися объявить свою цену за предмет торгов в случае, когда такое объявление предусмотрено законодательством, в результате чего торги признаны нерезультативными. В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов», размер штрафа установлен в размере 70 базовых величин за каждый лот.

В соответствии с пунктом 6 Положения о порядке выдачи, продления действия, переоформления и прекращения действия разрешения на размещение средства наружной рекламы, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 (далее – Положение), победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан не позднее 10 рабочих дней со для утверждения протокола торгов подать в Гомельский городской исполнительный комитет заявление по форме согласно приложению 3 к Положению и иные документы, предусмотренные в регламенте административной процедуры по получению разрешения на размещение средства наружной рекламы, утвержденном Министерством антимонопольного регулирования и торговли.

Договор на размещение (распространение) наружной рекламы с победителем торгов (приравненным к нему лицом) заключается в течение 10 рабочих дней со дня регистрации заявления на выдачу разрешения на размещение средства наружной рекламы при условии оплаты цены продажи предмета торгов и возмещения затрат организатору торгов

# ДУДА Ў КУБЕ?

## У другім туры прэзідэнцкіх выбараў з мінімальным адрывам перамог Наўроцкі

У мінулую нядзелю, 1 чэрвеня, у Польшчы прайшоў другі тур галасавання на прэзідэнцкіх выбарах. За прэзідэнцкае крэсла змагаліся два кандыдаты — дзейны мэр Варшавы Рафал Тшаскоўскі, які прадстаўляе «Грамадзянскую кааліцыю», і апанент дзейнай улады, які падтрымліваецца партыяй «Права і справядлівасць», Караль Наўроцкі. Ён заручыўся падтрымкай 50,89 % выбаршчыкаў.



Не так ужо і шмат, калі шчыра. Розніца паміж кандыдатамі склала крыху больш за 1,5 % галасоў. Паводле інфармацыі Нацыянальнай выбарчай камісіі Польшчы, другі кандыдат — Рафал Тшаскоўскі — атрымаў 49,11 % галасоў. Яўка выбаршчыкаў у другім туры прэзідэнцкіх выбараў склала 71,63 %. А гэта значыць, што амаль 30 % выбаршчыкаў вырашылі не ўдзельнічаць у тым фарсе, у якім прапанавалі зрабіць выбар не самага годнага кандыдата, а найменш горшага з двух магчымых варыянтаў.

Наогул, цяперашнія выбары прэзідэнта Польшчы можна ўносіць у аналы гісторыі як самыя брудныя і недэмакратычныя з мноствам скандалаў і выкрыццяў, самым жорсткім хейтам у інтэрнэце непажаданых кандыдатаў, абвінавачваннямі ў наркаспажыванні і сутэнёрстве. Гучыць жудасна, асабліва калі гаворка ідзе пра прэтэндэнта на прэзідэнцкае крэсла. Ці такіх лідараў заслугоўвае польскі народ?! Але мае на дадзены момант тых, каго мае...

«Мне шкада, што не ўдалося пераканаць большасць грамадзян у маім бачанні Польшчы. Шкада, што мы не перамаглі разам. Віншуем Караля Наўроцкага з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах», — прызнаў такім чынам сваё паражэнне ў сетцы X яго сапернік Рафал Тшаскоўскі.

Ён дадаў, што «гэта перамога з'яўляецца абавязацельствам, асабліва ў такія цяжкія часы. Асабліва пры такім блізкім выніку. Калі ласка, запомніце гэта».

«Урокі папярэдніх выбараў не былі засвоены», — заявіў у студыі РАР палітолаг з Ягелонскага ўніверсітэта, прафесар Яраслаў Фліс пасля перамогі Наўроцкага на прэзідэнцкіх выбарах, паведамляе БелТА. Цяперашняя кампанія вельмі падобная на прэзідэнцкія выбары 2020 года, калі Анджэй Дуда перамог таго ж Рафала Тшаскоўскага ў другім туры.

На думку Фліса, перамога Наўроцкага была нечаканай, але не пераканаўчай, а, хутчэй, знясільваючай.

Як адзначае выданне Onet, сцэнарый з перамогай Наўроцкага можа азначаць, што кіруючай кааліцыі застанецца ў асноўным адміністрацыйная функцыя да наступных парламенцкіх выбараў, якія запланаваны на восень 2027 года. Ва ўрадзе існуе перакананне, што Наўроцкі ў прэзідэнцкім палацы будзе Анджэем Дудам у кубе. Ніводзін буйны праект кіруючай кааліцыі не атрымае падтрымкі.

Дарэчы, прэзідэнт Польшчы не толькі мае права накладаць вета на законы, прынятыя парламентам, але і прызначае людзей, якія займаюць ключавыя пасады ў асобных дзяржаўных установах, у тым ліку выбірае трох членаў Савета па грашова-крэдытнай палітыцы і вылучае кандыдата на пасаду прэзідэнта Нацыянальнага банка Польшчы.

**Меркаванне**

# Чаго чакаць ад Польшчы пасля перамогі Наўроцкага на выбарах?

## Пра гэта ў эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» паразважаў дэкан факультэта журналістыкі БДУ Аляксей Бяляеў

Як падкрэсліў госць студыі, Наўроцкі — чалавек з жорсткай антыкамуністычнай, антырасійскай пазіцыяй.

— Я б сказаў, з русафобскай. У нейкі перыяд часу ён узначальваў досыць адыёзную структуру — Польскі інстытут нацыянальнай памяці. Менавіта ён датычны да поўнага зносу помнікаў савецкім воінам на тэрыторыі Польшчы. Гэта было фактычна яго рашэнне, якое ён прадаваў. З такога бэкграўнду зразумела, што, напрыклад, для Беларусі гэты кандыдат нічога добрага з сябе не ўяўляе. Акрамя таго, на сёння ён — відавочны стаўленік Вашынгтона, — адзначыў Аляксей Бяляеў.

Паводле яго, Польшча ўжо перманентна з'яўляецца прадстаўніком ЗША ў Еўропе.

— Па сутнасці, усе разумеюць, што гэта такі амерыканскі траянскі конь. Гэта было зроблена для таго, каб Польшча магла збіваць пыху з суседняй Германіі, выступала застрэльшчыкам пастаянных сварак, спрэчак з Расіяй, не давала Еўропе наладзіць нармальныя адносіны з усходнім партнёрам, што, як мы бачым, негатыўна адбіваецца на эканамічным стане Еўрасаюза, што выгадна ЗША, — дадаў эксперт.

Вяртаючыся да Наўроцкага, які перамог на выбарах, госць праграмы падкрэсліў: гэта дастаткова скандальны кандыдат.

— Мы бачылі, што падчас выбарчай кампаніі ў дачыненні да яго было выліта нямала кампрамату. Сам ён таксама падліў алею ў агонь, калі нешта ўжыў падчас прамога эфіру дэбатаў. Гэта значыць, у прынцыпе, дастаткова скандальны кандыдат, — канстатаваў Аляксей Бяляеў. — Ён даволі жорстка настроены і ў дачыненні да Украіны. Таму для яго, напрыклад, будуць нармальнымі пастаянныя дасылкі, згадкі той жа Валынскай разні, якая з'яўляецца раздражняльным фактарам у польска-ўкраінскіх адносінах. І вялікага піетэту ў адносінах да ўкраінскіх бежанцаў ён таксама не адчувае. Таму, думаю, тым жа ўкраінскім суседзям Польшчы трэба падрыхтавацца да таго, што новы прэзідэнт будзе займаць пазіцыю па паступовым размыканні нібыта сяброўскіх абдымкаў і па зніжэнні падтрымкі ўкраінскіх бежанцаў на тэрыторыі Польшчы.

Дэкан факультэта журналістыкі БДУ працягнуў:

— Для нас Наўроцкі быў і застаецца ідэалагічным ворагам. Яго пазіцыя заключаецца ў знішчэнні ўсякай памяці аб тым, што Польшча калісьці мела добрыя сувязі з Савецкім Саюзам. Усю гістарычную спадчыну савецкай эпохі ён будзе старанна вычышчаць, карыстаючыся сваімі прэзідэнцкімі паўнамоцтвамі. Зразумела, што ідэалагічна нам абсалютна не па дарозе з такім таварышам.

Каментуючы парушэнні, якія былі выяўлены падчас прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы, Аляксей Бяляеў адзначыў:

— Чаму здзіўляцца, калі нядаўна прайшлі выбары ў Румыніі, якія не адразу прызналі нармальнымі, хоць і прэзідэнт Францыі заявіў, што ўмешваўся ў гэтыя выбары, і прэзідэнт Малдовы заклікала і потым дзякавала сваім грамадзянам за ўмяшанне. Мы бачылі, як здымаліся непажаданыя кандыдаты. Падобнае рэалізуецца ў цэлым па Еўропе. Чаму Польшча з рознымі парушэннямі павінна быць выключэннем? На жаль, Еўропы такое паняцце, як сумленныя і свабодныя выбары, не датычыцца. Сёння Еўропа — гэта тыповая імперыя, дзе, па сутнасці, адбываюцца не выбары, а прызначэнне стаўленікаў цэнтральнай улады. Толькі цяпер ідзе спрэчка, дзе гэта ўлада ўсё ж такі знаходзіцца: у Брусялі ці Вашынгтоне.

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Добрушское РайПО** (продавец) извещает о проведении **13 июня 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 311/С-51601 общей площадью 344,0 кв. м, наименование – Магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание магазина с надворными постройками: складом, уборной. Капитальное строение с инв. № 311/С-51602 общей площадью 56,0 кв. м, наименование – Склад, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание склада

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282808301000125 площадью 0,1576 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, д. Хорошевка, ул. Юбилейная, 1А

**Начальная цена** продажи без НДС – 31 010,00 бел. руб.
**Задаток** – 310,10 бел. руб.

**Лот № 2:** Капитальное строение с инв. № 311/С-52024 общей площадью 141,9 кв. м, наименование – Магазин № 14, назначение – Здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой и котельной здание магазина. Капитальное строение с инв. № 311/С-52023 общей площадью 17,1 кв. м, наименование – Гараж, назначение – Здание специализированное транспорта, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание гаража. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321284803901000149 площадью 0,0430 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Ленинский с/с, аг. Красный Партизан, ул. Краснопартизанская, 1

**Начальная цена** продажи без НДС – 15 288,00 бел. руб.
**Задаток** – 152,88 бел. руб.

**Лот № 3:** Капитальное строение с инв. № 311/С-50662 общей площадью 262,7 кв. м, наименование – Магазин № 41, назначение – Здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: навесом, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000786 площадью 0,1050 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 2. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

Лот включает оборудование в количестве 12 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи без НДС – 47 820,00 бел. руб.
**Задаток** – 478,20 бел. руб.

**Лот № 4:** Капитальное строение с инв. № 311/С-52960 общей площадью 226,7 кв. м, наименование – Магазин № 40, назначение – Здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: Одноэтажное блочное облицованное кирпичом здание магазина, с надворными постройками: сараем, уборной, забором. Капитальное строение с инв. № 311/С-49825 общей площадью 31,0 кв. м, наименование – Склад, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное здание склада. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000787 площадью 0,0617 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Кирова С.М., 120А

Лот включает оборудование в количестве 8 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи без НДС – 28 966,00 бел. руб.
**Задаток** – 289,66 бел. руб.

**Лот № 5:** Капитальное строение с инв. № 311/С-50661 общей площадью 216,0 кв. м, наименование – Кафе-кулинария, назначение – Здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000454 площадью 0,0659 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 1. Лот включает оборудование в количестве 8 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи без НДС – 22 610,00 бел. руб.
**Задаток** – 226,10 бел. руб.

**Лот № 6:** Капитальное строение с инв. № 311/С-51318 общей площадью 64,6 кв. м, наименование – Магазин № 18, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание с надворными постройками: сараем, уборной, двумя крыльцами, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100003001592 площадью 0,0316 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Крылова. Лот включает оборудование в количестве 5 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи без НДС – 28 247,80 бел. руб.
**Задаток** – 282,48 бел. руб.

**Лот № 7:** Капитальное строение общей площадью 124,7 кв. м, наименование – Здание магазина, назначение – Нет сведений, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321275703601000472 площадью 0,0752 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, ул. Ленина В. И.

Лот включает оборудование в количестве 12 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи без НДС – 47 460,00 бел. руб.
**Задаток** – 474,60 бел. руб.

**Лот № 8:** СОТ Кореневка (Торговый пав.), инв. № 1355/474, Морозильник ММ 163, инв. № 247/3321, Холодильник торг., инв. № 1518/492, Сигнализация пож., инв. № Хза304, Сигнализация охр., инв. № Хза87, ТОРГОВОЕ ОБОР. (Прилавок), 2 шт., инв. № Хза89, ТОРГОВОЕ ОБОР. (Стеллажи), 3 шт., инв. № 1356/474. Заключен договор аренды от 27.05.2025 г. № б/н

**Начальная цена** продажи без НДС – 4 190,20 бел. руб.
**Задаток** – 41,90 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

**Продавец: Добрушское РайПО**, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 44 590-84-01.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 12.06.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона:**
**+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

СПОРТ-ТАЙМ

# СПАРТЫЎНЫЯ ДРАМЫ З НЕВЕРАГОДНАЙ РАЗВЯЗКАЙ

## Чаму гэты сезон гістарычны для баскетбола і гандбола

Вясна скончылася разам з чэмпіятамі Беларусі сярод мужчынскіх камандаў па гандболе і баскетболе. З кожным годам узровень унутраных чэмпіянатаў па гэтых папулярных відах спорту расце, прыцягваючы ўсё больш увагі.

І кожны год вынік быў больш-менш прадказальным, хоць і не без інтрыгі. Але сезон 2024/2025 здзівіў і стаў без перабольшвання гістарычным. Пачнём з баскетбола. У фінале чэмпіянату Беларусі сустрэліся даўнія сапернікі — «Мінск» і «Гродна-93». Серыя атрымалася досыць напружанай і скончылася з вынікам 3:2 на карысць гродзенскіх баскетбалістаў. Каманда з горада над Нёманам спыніла «гегемонію» сталічных баскетбалістаў — «Мінск» нікому не аддаваў званне чэмпіёна краіны з 2009 года. А баскетбалісты «Гродна-93» апошні раз заваявалі «золата» ўнутранага чэмпіянату аж у 2004-м. Цяпер у іх актыве 9 тытулаў.

«Мы доўга ішлі да гэтай перамогі. Пяць матчаў у паўфінале, пяць — у фінале... Перад заключнай гульнёй нам трэба было проста супакоіцца: мы вялі, у чым мацнейшыя за саперніка. Я вельмі рад, што мы выйгралі. Дзякуй балельшчыкам — яны былі шыкоўныя, як і заўсёды. Іх падтрымка вельмі дапамагала нам. У гэтым сезоне мы выйгралі і Кубак, і чэмпіянат Беларусі — атрымаўся добры год!» — падзяліўся ўражаннямі капітан «Гродна-93» Аляксей Трасцянецкі. Ён, дарэчы, быў прызнаны і найлепшым нападаючым чэмпіянату.

Серыя паміж гродзенскай і мінскай камандамі праходзіла ў сталіцы і ў Лідзе. І калі Мінск прывык да вялікіх спартыўных падзей, то райцэнтрам гэта пакуль у навіну. Проста зафіксуем для гісторыі: чэмпіянат Беларусі па баскетболе стаў больш непрадказальным і сапраўды народным.

Сенсацыяй скончыўся і мужчынскі чэмпіянат Беларусі па гандболе. Пачыналася таксама ўсё больш-менш традыцыйна. У фінале сустрэліся СКА-Мінск і «Мяшкоў-Брэст». Фінальная серыя расцягнулася на пяць матчаў і скончылася з вынікам 3:2 на карысць СКА-Мінск. Упершыню за 21 год сталічныя гандбалісты абыгралі брэсцкіх! Апошні раз СКА-Мінск станавіўся чэмпіёнам Беларусі ў 2002 годзе. Брэсцкія гандбалісты выйгравалі 11 чэмпіянатаў запар, усяго ў іх 16 тытулаў. Але «гегемонія» скончылася.

Гэта перамога — сапраўдны трыумф галоўнага трэнера СКА-Мінск Дзмітрыя Нікуленкава. Выхадзец з каманды, ён пасля заканчэння гульнявой кар'еры пачаў працаваць з хлопцамі, якія яшчэ нават не нарадзіліся ў той час, калі СКА апошні раз стаў чэмпіёнам Беларусі. І разам з імі напісаў новую прыгожую старонку ў гісторыі армейцаў. «Гэта перамога маладых хлопцаў, яны зрабілі вынік. Яны працавалі для трыумфу! Мы два гады падалі, падалі і яшчэ раз падалі, але падымаліся, падымаліся і яшчэ раз падымаліся. У нас змянілася палова каманды, аднак мы кожны раз трымаліся, спрабавалі нешта зрабіць. Я ганаруся сваімі хлопцамі, дзякуй ім вялікі», — не хаваў эмоцый Дзмітрый Нікуленкаў пасля перамогі з вынікам 29:27.

І хто пасля такіх гісторый скажа, што чэмпіянаты Беларусі — нецікавыя і прадказальныя?

**Валерыя СЦЯЦКО.**


Фота БелТА.

НАДВОР'Е

# ГОРАЧА, АЛЕ ДАЖДЖЛІВА

## Прыпячэ да 31 °C!

Беларусь зноў накрылі палі франтальнай воблачнасці. «Перыядычна будуць адзначацца дажджы рознай інтэнсіўнасці, не выключаны моцныя, высокая верагоднасць навальніц», — адзначылі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, месцамі моцныя. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 9—16 °C, днём будзе 17—24 °C.

У сераду месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 6 да 13 °C. Днём будзе 19—26 °C. «У начны і ранішні час у вільготным паветры месцамі па краіне будуць згушчацца туманы. Бачнасць пры гэтым можа пагаршацца да 500 метраў і менш. Таму на дарогах трэба быць вельмі ўважлівымі як вадзіцелям, так і пешаходам», — папярэдзілі ў Белгідрамеце.

У чацвер ноччу пераважна без ападкаў, днём на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі моцныя, а таксама навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны, днём пры навальніцах парывісты, месцамі моцны. Тэмпература паветра ўначы — 8—14 °C, па захадзе краіны — да 17 °C, днём — 23—29 °C, па поўдні Беларусі месцамі — 30-31 °C.

### У тэму

### Вільгаці з лішкам

Інтэнсіўныя дажджы палепшылі вільгацезабяспечанасць сельскагаспадарчых культур. Аб гэтым паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Як лічаць спецыялісты, інтэнсіўныя дажджы ліквідавалі недабор ападкаў, які назіраўся з пачатку вегетацыйнага перыяду. Вільгацезабяспечанасць сельскагаспадарчых культур на большай частцы тэрыторыі краіны значна палепшылася. Складаюцца добрыя аграметэаралагічныя ўмовы для адрастання травы, фарміравання прадукцыйнасці збожжавых, росту і развіцця іншых культур. Сярэдняя тэмпература верхняга пласта глебы складае ад плюс 14 да 19 °C, што садзейнічае з'яўленню ўсходаў позніх культур.

«На большай частцы краіны назіраецца пераўвільгатненне верхняга 10-сантыметровага пласта глебы, што ўскладняе правядзенне агратэхнічных мерапрыемстваў па доглядзе раслін, першага ўкосу траў. У найбліжэйшы час з-за чаканага няўстойлівага надвор'я ўмовы для нарыхтоўкі кармоў будуць не вельмі спрыяльныя», — прагназуюць аграметэаролагі.

У МНС папярэдзілі аб фактарах небяспекі падчас навальніц. У непагадзь магчымыя пашкоджанні (абрывы) ліній сувязі і электраперадачы, адключэнні электрычных падстанцый, электраэнергіі ў населеных пунктах. Падчас навальніцы могуць узнікнуць лясныя пажары, а таксама пажары ў жылых і вытворчых будынках.





Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

### 3 ЧЭРВЕНЯ — Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1786** год — нарадзіўся (м. Жалудок, цяпер пасёлак — у Шчучынскім раёне) Канстанцін Тызенгаўз, беларускі прыродазнавец, асветнік. Займаўся навуковай працай у галіне арніталогіі. Заснавальнік беларускай арніталогіі, работы якога не страцілі свайго значэння да нашага часу. Распрацаваў сістэму класіфікацыі птушак, ёю карыстаюцца сучасныя вучоныя. У сваім маёнтку ў Паставах стварыў арніталагічны музей, сабраў карцінную галерэю, бібліятэку.

**1912** год — на хутары Акопы Янка Купала паставіў апошнюю кропку ў камедыі «Паўлінка».

**1935** год — нарадзіўся (в. Мачулішча, Крупскі раён) Васіль Зуёнак, беларускі пісьменнік, паэт, перакладчык, літаратуразнавец і крытык. Кандыдат філалагічных навук. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1982 год, за паэму «Маўчанне травы»).

У свеце

**1785** год — француз Франсуа Бланшар прадэманстраваў у Лондане сканструяваны ім парашут для скачкоў з паветранага шара, скінуўшы ў ім сабаку з вышыні 300 метраў.

**1885** год — нарадзіўся Якаў Міхайлавіч Свярдлоў, вядомы савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, старшыня УЦВК, сакратар ЦК бальшавіцкай партыі. У 1905 г. узначаліў камітэт РСДРП у Екацярынбургу, у 1906-м — член Уральскага абласнога камітэта. Як упаўнаважаны ЦК РСДРП працаваў у Пецярбургскай партыйнай арганізацыі, удзельнічаў у падрыхтоўцы выдання газеты «Звезда», у падрыхтоўцы І кангрэса Камінтэрна. Браў удзел у стварэнні БССР. Яго імем названы вуліцы ў многіх гарадах Беларусі.

**1917** год — адкрыты І Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, на якім большасць мелі меншавікі і эсэры. З'езд адхіліў прапанаваныя бальшавікамі рэзалюцыі аб спыненні вайны і перадачы ўсёй улады Саветам і прыняў эсэра-меншавіцкія рэзалюцыі, якія абвяшчалі поўную падтрымку міністраў-сацыялістаў і працяг «рэвалюцыйнай вайны» на прынцыпах адмовы ад анексій і кантрыбуцый.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 867 Індэкс 63850. Зак. № 1301.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 чэрвеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12